Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ВЕРАСНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №183 (28547)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ігар Сігоў пра пошук станоўчага ў адмоўным**

СТАР. 5

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

НАПАЧАТКУ БЫЛО Слова

**Пераможцы «Скарыніяны»**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Да канца года ў Беларусі будуць пералічаны працоўныя пенсіі. Аднак рашэнне аб тэрмінах і памерах павышэння пенсій яшчэ не прынятае. У адпаведнасці з заканадаўствам працоўныя пенсіі пераразлічваюцца ў сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы не менш як адзін раз у год у межах сродкаў бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Пры гэтым пераразлік працоўных пенсій праводзіцца на падставе ўказаў Прэзідэнта. Тэрміны і аб'ёмы пераразліку працоўных пенсій у 2017 годзе будуць вызначацца з улікам выкладзенага».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9457 | ▲ |
| Еўра | 2,3140 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0334 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17183>

# Цёплая восень



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Ужо сямнаццаць гадоў Лілія КАРАЛІНСКАЯ кожны дзень аб'язджае на веласіпедзе дзесяць-пятнаццаць кіламетраў, менавіта так сацыяльны работнік зможа наведаць сваіх падапечных. У сумцы — прадукты, хімікаты для апрацоўкі агарода, насенне, лекі, камунальныя плацяжы.**

**На папячэнні дэпутата сельскага Савета і старасты — пятнаццаць чалавек з вёсак Коскі, Крысава, Зосіна ў Дзяржынскім раёне. У «абавязковай» праграме — памераць ціск. І зазірнуць на агарод. У вёсцы для пажылых свая гаспадарка — аддушына. Вось і Тамара Леанардаўна НАВІЦКАЯ не ўяўляе сваё жыццё без градак. «Нават не хварэе, пакуль ураджай вырошчвае ды збірае», — усміхаецца Лілія Пятроўна. І спрытна бяжыць дапамагаць.**

■ Фінансы

## НАВОШТА НАМ ДОЛАРЫ?

**Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей КАЛЕЧЫЦ расказаў аб дэдаларызацыі эканомікі Беларусі**

### Сыходзіць ад прывязкі да замежнай валюты

«У нас склаўся высокі ўзровень даларызацыі. Гэта датычыцца выкарыстання замежнай валюты і як сродку назапашвання, і як сродку плацяжоў. Да гэтага часу дзейнічаў шэраг дазволаў асобным суб'ектам гаспадарання, для спецыяльных кірункаў дзейнасці выкарыстоўваць валюту. Мы разумеем: каб узмацніць ролю нацыянальнай валюты і сысці ад выкарыстання замежнай, перш за ўсё трэба забяспечыць стабільнасць нацыянальнай валюты. І сёння для гэтага робіцца ўсё неабходнае», — канстатаваў прадстаўнік Нацбанка.

Але ёсць і другі складнік работы па дэдаларызацыі. «Гэта сыход ад такіх дазволаў, сыход ад нейкіх прэферэнцый, якія атрымлівалі некаторыя галіны, некаторыя прадпрыемствы, маючы магчымасць выкарыстоўваць замежную валюту. І мы ў гэтым кірунку працуем. У ідэале лічым, што трэба сыходзіць ад прывязкі да замежнай валюты ва ўсіх астатніх момантах», — падкрэсліў Сяргей Калечыц.

Акрамя таго, існуе план лібералізацыі валютнага заканадаўства. «Ён прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў, якія датычацца таго, што калі ўнутры нашай эканомікі павінна выкарыстоўвацца пераважна нацыянальная валюта, то, з другога боку, важным фонам для гэтага павінна быць магчымасць свабодна для знешніх разлікаў набываць і выкарыстоўваць валюту без якіх-небудзь абмежаванняў. Прадугледжваецца і паступовая адмена абавязковага продажу валюты, і палягчэнне доступу да куплі валюты, і адмена мэтавага накіравання. У канчатковым выніку — поўная лібералізацыя адносін, звязаных з рухам капіталу».

СТАР. 4

■ Нараджэнне традыцый

## Што летам уродзіцца, тое зімой спатрэбіцца

**На Гродзеншчыне ўшанавалі хлеб, лён, бульбу, памідор і дуб**

**Самабытныя, смачныя і пазнавальна-творчыя святы адбыліся сёлета ў розных раёнах Гродзеншчыны. Так, памідорная сталіца вобласці Іўе славіла памідор, згатаваўшы трохметровы бутэрброд. У Астраўцы варылі каву з жалудоў. А на Карэліччыне ўшаноўвалі яблыкі, мёд, хлеб, бульбу, лён — кожнай сельскагаспадарчай культуры прысвяцілі асобнае мерапрыемства з песнямі, конкурсамі і нацыянальнымі стравамі. Усе святы ладзіліся ўпершыню, аднак іх арганізатары ўпэўненыя, што такія побытавыя фэсты стануць брэндавымі візітоўкамі раёнаў.**

СТАР. 4



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## Зносіны побач

**Заўтра, 23 верасня, на традыцыйных прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць па суботах з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 (016) 2213121;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 (021) 2222222;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 (023) 2751237;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 (015) 2735644;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 (022) 2501869;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА. Тэл. 5004160;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 222 44 44

■ Знешняя палітыка

# НА ЎЗРОЎНІ НЬЮ-ЁРКА

**Міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ прыняў удзел у 72-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Як паведамляе прэс-служба знешнепалітычнага ведамства, 19 верасня ён узяў удзел у адкрыцці дыскусіі высокага ўзроўню названай сесіі ГА ААН.**

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства правёў таксама ў штаб-кватэры ААН шэраг двухбаковых сустрэч. Падчас сустрэчы з адміністратарам ПРААН Ахімам Штайнерам абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, узаемадзеяння ў сферы дасягнення Мэт устойлівага развіцця.

Уладзімір Макей паведаміў, што Беларусь плануе правесці рэгіянальную канферэнцыю для нацыянальных каардынатараў з Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Мінску ў пачатку 2018 года для абмену вопытам рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Міністр запрасіў Ахіма Штайнера наведаць Беларусь.

Кіраўнік ПРААН пацвердзіў гатоўнасць да далейшага супрацоўніцтва з Беларуссю па пытаннях пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы, а таксама выказаў зацікаўленасць у далейшым развіцці ўзаемадзеяння па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

На сустрэчы з першым намеснікам старшыні ўрада — міністрам замежных спраў Сербіі Івіцам Дачычам былі разгледжаны пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемадзеяння краін у міжнародных арганізацыях, дадзена ацэнка ходу рэалізацыі сумесных праектаў. Міністрамі таксама ўзгоднена серыя сумесных мерапрыемстваў на найбліжэйшую перспектыву.

Пытанні двухбаковага супрацоўніцтва былі ў цэнтры ўвагі на сустрэчы з міністрам замежных спраў Фінляндыі Ціма Сойні. Па просьбе суразмоўцы кіраўнік знешнепалітычнага ведамства таксама праінфармаваў фінляндскага калегу аб ходзе правядзення Беларуссю сумесна з Расіяй ваенных вучэнняў «Захад-2017», звярнуўшы ўвагу на празрыстасць характар мерапрыемства і адпаведнасць арганізацыі вучэнняў міжнародна-прававым абавязацельствам. Акрамя таго, бакі абмяняліся падыходамі двух дзяржаў па пытаннях правоў чалавека.

У той жа дзень Уладзімір Макей правёў сустрэчу з кіраўніцтвам Амерыканскага яўрэйскага камітэта, падчас якой бакі абмяняліся меркаваннямі па пытаннях захавання і ўшанавання месцаў, звязаных з гісторыяй яўрэйскага народа ў Беларусі.

А 20 верасня на палях 72-й сесіі ГА ААН пад старшынствам міністра замежных спраў Беларусі адбылася сустрэча кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў краін — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). У сустрэчы таксама прыняў удзел Генеральны сакратар АДКБ Юрый Хачатураў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Меркаванне

# ПРЫЕМНЫЯ ЧАКАННІ?



## За кошт чаго развіваецца айчынная эканоміка

**2015—2016 гады выдаліся вельмі цяжкімі для беларускай эканомікі. І для гэтага былі аб'ектыўныя падставы. Супала шмат негатыўных знешніх і ўнутраных фактараў. Сур'ёзнай праблемай стала сутыкненне Расіі з Захадам, якое па традыцыі прынесціь негатыўныя наступствы для размешчанай паміж імі Беларусі.**

Узаемныя санкцыі двух праціўнікаў ударылі па перавозках у транзітнай Беларусі, пазбавіўшы эканоміку часткі даходаў. Меры Захаду па прымушэнні Расіі да той палітыкі, што яму больш даспадобы, нанеслі сур'ёзны ўдар па расійскай эканоміцы, ключавым рынку для збыту беларускай прадукцыі. Украіна, акунуўшыся ў грамадзянскую вайну і адрэзаная ад расійскага рынку, стала набываць нашмат менш беларускай прадукцыі, а гэта другі найважнейшы рынак для беларускіх экспарцёраў. Супала так, што прыкладна ў той жа перыяд рэзка ўпалі цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю на сусветным рынку, а гэта адзін з найважнейшых напрамкаў беларускага экспарту. Больш за тое, нізкія цэны на харчовыя тавары ў свеце непазбежна цягнуць для Беларусі наступную праблему — падзенне цэн на калійныя ўгнаенні, рэсурс, які знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці і які прыносіць значныя прыбыткі для бюджэту.

Непрыемным фактам сталі і праблемы сусветнай металургічнай галіны. Адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны, Беларускі металургічны завод, прайшло вельмі дарагую мадэрнізацыю па найлепшых сусветных стандартах, але ў момант, калі гэта павінна было пачаць прыносіць плён, цэны на металургічныя вырабы значна ўпалі. Замест чаканых даходаў ад сучаснай вытворчасці прыйшлося трацішча на яе захаванне. Вельмі вялікія страты панесла будаўнічая галіна, у новай сітуацыі вельмі абмежаваных рэсурсаў ранейшыя аб'ёмы будаўніцтва сталі немагчымыя. Трэба адзначыць, што ў Беларусі ад непрыемнага супадзення мноства негатыўных фактараў пацярпелі аднолькава і прыватныя, і дзяржаўныя прадпрыемствы.

Што чакаць у бягучым годзе і наступным? Прыемна адзначыць, што, верагодна, 2016 год быў найгоршым годам у скрыжаванні мноства праблем для беларускай эканомікі, і цяпер краіне будзе лягчэй з кожным наступным годам. Першыя даныя па эканоміцы гэтага года выклікаюць стрыманы аптымізм. За студзень—жнівень ВУП краіны вырас на 1,6 працэнта, што знаходзіцца ў прыемным кантрасце з падзеннем у 2015 і 2016 гадах. Якія фактары прывялі да пазітыўных наступстваў і змены чаканняў з негатыўных на станоўчыя?

Перш за ўсё, Расія пачала адаптавацца да той цяжкай сітуацыі, у якой апынулася. Несумненна, што страта сотняў мільярдаў долараў у выніку дзеянняў Захаду па ўвядзенні санкцый і арганізацыі падзення цэн на нафту і нафтапрадукты на сусветным рынку нанеслі ёй вялікую шкоду. Але несумненна і тое, што ў расійскай эканоміцы заўсёды быў вялікі патэнцыял, а наяўнасць уласных прыродных рэсурсаў палегчыла сітуацыю. Акрамя таго, санкцыі маглі б быць нашмат больш жорсткімі, як гэта было зроблена Захадам супраць Ірана па яго ядзернай праграме, і нанесці нашмат большую шкоду. У выніку расійская эканоміка спыніла падзенне і пачала аднаўляцца, сталі расці зарплаты, якія рэзка ўпалі пасля пачатковага перыяду супрацьстаяння, а, такім чынам, да беларускіх экспарцёраў сталі вяртацца магчымасці па збыце сваёй прадукцыі на найважнейшы экспартны рынак. Дадатковым пазітыўным фактарам стала больш спрыяльная цанавая кан'юнктура па шэрагу экспартуемых Беларуссю тавараў. У выніку ў студзені—ліпені 2017 года беларускі экспарт вырас на 24,4 працэнта ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года.

Наступным фактарам стаў невялікі, але ўсё ж пазітыў у эканоміцы Украіны. Падзенне спынілася, пачаўся невялікі рост эканомікі, і намеціўся рост заробкаў, якія апусціліся ў 2014—2015 гадах на непрыстойна нізкі для Еўропы ўзровень. У студзені—ліпені 2017 года беларускі экспарт вырас на 19,1 працэнта.

Стаў ажываць і казахстанскі рынак, які цяжка перанёс падзенне цэн на нафту. Экспарт вырас на 64,8 працэнта.

З іншых значных рынкаў у 2017 годзе найбольш сур'ёзна парадаваў брытанскі, на які экспарт беларускіх тавараў фактычна падвоіўся.

Для аднаўлення транзітных перавозак, пацярпелых з-за аб'ёмаў перавозак паміж Расіяй і Захадам, якія рэзка ўпалі, ключавую ролю адыграла ініцыятыва «Аднаго пояса — аднаго шляху», якая рэалізуецца разам з Кітаем. Кантэйнерныя перавозкі паміж Кітаем і ЕС па тэрыторыі Беларусі растуць імклівымі тэмпамі, падвоіўшыся ў 2016 годзе.

Найбольшую трывогу ўсё ж выклікае стан спраў у будаўнічай галіне. У студзені—жніўні 2017 года яна асела на 7,7 працэнта. Між тым будаўнічая галіна вельмі важная для ўпэўненага аднаўлення эканомікі пасля страт у папярэдніх гады. Будаўніцтва дае заказы для мноства іншых галін, падахвочваючы і іх эфектыўна развівацца.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.**

■ На прыёме

# ЗВЯРНУЛІСЯ ПА АДРАСЕ

## Мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны зацікавіць людзей добраўпарадкоўваць месца, дзе яны жывуць

**Жыткавічы рыхтуюцца да правядзення абласных Дажынак, і зараз у населеным пункце на захадзе Гомельшчыны ідуць актыўныя работы па навядзенні глянцу перад прыемнай падзеяй. Пра добраўпарадкаванне зайшла размова і падчас прыёму грамадзян першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максімам РЫЖАНКОВЫМ. Жыхарка вёскі Ляхавічы Жыткавіцкага раёна паскардзілася на адсутнасць агароджы на мясцовых могілках.**

— Ёсць яшчэ некаторае непаразуменне паміж жыхарамі і мясцовымі органамі ўлады, — адзначае Максім Рыжанкоў. — Я маю на ўвазе сельскія, пасялковыя Саветы, якія могуць дзесьці атрымаць дапамогу ад раённай вертыкалі, дзесьці ўцягнуць у рашэнне пытання самі грамадзян, якія не заўсёды разумеюць, што яны таксама павінны нешта рабіць для таго месца, дзе жывуць. Аказваецца, калі разам сабраць рэсурсы, прыцягнуць мясцовыя грамадскія арганізацыі, то справы рухаюцца. Як па пытанні агароджвання могілак. Грошы ёсць на матэрыялы, дык трэба разам сабрацца — прафсаюзы, БРСМ, прадстаўнікі мясцовага дэпутацкага корпуса — і зрабіць гэтую агароджу. Сельскія выканкамы ў такіх выпадках павінны праяўляць больш ініцыятывы. Быць матыватарам і арганізатарам людзей.

Дэпутаты мясцовых Саветаў павінны быць самымі блізкімі памочнікамі ўлады ў рэгіёнах пры рашэнні праблем насельніцтва, падкрэсліў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

— Дэпутаты павінны быць галоўнымі правадырамі паміж грамадзянамі і выканаўчай вертыкаллю, а не з'яўляцца перад народам раз на чатыры гады напярэдадні выбараў. Яны павінны бачыць і ведаць праблемы людзей, дапамагаць акумуляваць пытанні і даносіць іх да ўлад з пэўнымі прапановамі па рашэнні.

Дарэчы, адзін з наведвальнікаў, **дырэктар мясцовай ДЮСШ і дэпутат мясцовага райсавета Леанід МАКАРЭВІЧ**, агучыў на прыёме такую праблему:

— На працягу 27 гадоў у Жыткавіцкай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе развівалі гіравы спорт і дасягнулі ў ім значных поспехаў. Тут выхавалі 80 майстроў спорту. Але больш як год таму гіравы спорт вывелі з праграмы дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ.

Кіраўнік жыткавіцкай спартыўнай установы звярнуўся з прапановай аднавіць гіравы спорт у раскладзе заняткаў школы.

— Думаю, што пытанне вырашыцца станоўча на працягу тыдня, — адказаў Максім Рыжанкоў.

Па яго словах, Жыткавіцкі раён ад іншых рэгіёнаў краіны, дзе праблемныя застаюцца тэмы ЖКГ і працаўладкавання, адрозніваецца тым, што агучаныя пытанні не ўваходзяць у кампетэнцыю мясцовых улад і сапраўды патрабуюць рашэння на больш высокім узроўні:

— У Жыткавічах узнятыя менавіта тыя пытанні, якія раённая ўлада сама не можа вырашыць. Людзі, якія прыйшлі на прыём, трапілі па адрасе. І ім трэба пастарацца дапамагчы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
*г. Жыткавічы*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Улады Шры-Ланкі ўпершыню прызналі існаванне ў краіне «дзіцячых фермаў» па продажы малых замежнікам



Урад Шры-Ланкі прызнаў факт існавання ў краіне ў 1980-я гады так званых дзіцячых фермаў, якія прадавалі дзяцей, каб задаволіць замежны попыт на ўсынаўленне. Шматлікія факты незаконнай дзейнасці былі раскрыты на тэлебачанні Нідэрландаў у дакументальнай праграме Zembla. Затым з'явілася рэакцыя ўлад азіяцкай краіны.

Міністр аховы здароўя Шры-Ланкі Раджыта Сенаратні прызнаў, што ў краіне сапраўды вёўся продаж дзяцей замежнікам. «У той час было шмат дзіцячых фермаў, — сказаў кіраўнік міністэрства аховы здароўя. — Яны збіралі там дзяцей і прадавалі іх замежным грамадзянам для ўсынаўлення». Пры гэтым Сенаратні паведаміў, што ў Шры-Ланцы будзе распрацаваны механізм па пошуку сапраўдных бацькоў незаконна ўсыноўленых дзяцей. «Урад павінен паставіць да гэтага вельмі сур'ёзна. Мы павінны будзем стварыць спецыяльнае агенцтва, дзе бацькі і дзеці змогуць прайсці ДНК-тэст. Гэта стане простым метадам высветліць, родныя яны адно аднаму, ці не. Я вазьму на сябе гэтую ініцыятыву», — паабяцаў міністр аховы.

### Пентагон: КНДР пакуль не даказала здольнасць стварэння ядзерных балістычных ракет

КНДР на гэты час не прадэманстравала здольнасць стварэння ядзерных боегаловак, прызначаных для ўстаноўкі на балістычных ракетах (БР) і якія змаглі б вытрымаць працэс уваходжання ў атмасферу. Гэта прызнаў кіраўнік Стратэгічнага камандавання ўзброеных сіл ЗША генерал Джон Хайт, выступаючы ў Гудзонаўскім інстытуце ў Вашынгтоне.

«Мы разумеем, што яны запускаюць. Мы разумеем, што яны дэманструюць. Адзінай рэччу, якую яны яшчэ не прадэманстравалі, з'яўляецца здольнасць звесці ўсё разам ад пачатку да канца, і выкарыстаць гэта», — заявіў амерыканскі генерал. Яму былі зададзены пытанні аб тым, ці змагла Паўночная Карэя, паводле ацэнак Пентагона, вырашыць праблему ўстаноўкі ядзерных боезарадаў на БР і ці ведае ўрад ЗША, якімі былі галаўныя часткі ракет, што былі выпрабаваны ў ліпені Пхеньянам і названыя амерыканцамі міжкантынентальнымі. «Магу вам сказаць, што ў паўночных карэйцаў няма інфраструктуры гэтага роду, няма выпрабавальных палігонаў, радараў. Яны не прадэманстравалі нам усё ад пачатку да канца», — падкрэсліў генерал.

### «Барселона» апублікавала заяву на тэму сітуацыі ў Каталоніі, якая мае намер правесці галасаванне па пытанні аддзялення ад Іспаніі

Услед за падзеямі, якія адбыліся ў апошнія дні, і асабліва сёння, у святле цяперашняй палітычнай сітуацыі ў Каталоніі футбольны клуб «Барселона», захоўваючы вернасць сваім гістарычным імкненню да абароны нацыі, прыхільнасць да дэмакратыі, свабоды слова і самавызначэння, асуджае любыя дзеянні, якія могуць перашкаджаць свабоднаму выкананню гэтых правоў». Такім чынам, футбольны клуб «Барселона» публічна выказаў сваю падтрымку ўсім людзям і арганізацыям, якія працуюць, каб гарантаваць гэтыя правы. «Барселона», захоўваючы поўную павагу да разнароднага складу членаў клуба, працягне падтрымліваць волю большай часткі насельніцтва Каталоніі і будзе рабіць гэта ў вятлівай, мірнай і годнай форме», — сказана ў тэксце.

На 1 кастрычніка ў Каталоніі запланаваны рэферэндум аб аддзяленні ад Іспаніі.

# УЗГАДНІЦЬ РАБОЧЫЯ ПЛАНЫ

**Каардынацыйная камісія Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў па падрыхтоўцы да ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года працягвае работу ў Мінску.**
**Яе ўзначальвае старшыня НАК Грэцыі Спірас Капралас. У нашым Нацыянальным алімпійскім камітэце ўжо адбыліся рабочыя нарады і сумеснае пасяджэнне Каардынацыйнай камісіі ЕАК з прадстаўнікамі рэспубліканскага аргкамітэта і фонду «Дырэкцыя ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года».**

На пасяджэнні дамовіліся, што група экспертаў Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў будзе дапамагаць прымаючай краіне ў падрыхтоўцы да Еўрагульняў-2019. У ЕАК таксама адзначылі важную ролю дзяржаўных органаў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы. *«Дырэктарат ІІ Еўрагульняў мае добры рабочы план, створана прафесійная каманда, якая непасрэдна займаецца падрыхтоўкай гульняў»,* — расказвае **старшыня Каардынацыйнай камісіі ЕАК, прэзідэнт НАК Грэцыі Спірас КАПРАЛАС**. — *У складзе Каардынацыйнай камісіі прыбыла і група экспертаў у розных кірунках арганізацыі спартыўнага форуму. Гэтыя спецыялісты дапамогуць і параяць, як вырашыць найбольш эфектыўна тую ці іншую праблему, якая паўстане ў ходзе падрыхтоўкі. Паспяховае правядзенне гэтай мультыспартыўнай падзеі ў 2019 годзе дапаможа і ў далейшым прасоўваць ідэю Еўрагульняў».*

**Міністр спорту і турызму Аляксандр ШАМКО** адзначыў, што ход выканання ўзятых Беларуссю на сябе кантрактных абавязацельстваў знаходзіцца на кантролі ў прэм'ер-міністра Беларусі, старшыні рэспубліканскага аргкамітэта па правядзенні Еўрагульняў Андрэя Кабякова. *«Маючая адбыцца ў 2019 годзе спартыўная падзея з'яўляецца цудоўнай пляцоўкай для дэманстрацыі дасягненняў у развіцці спорту, эканомікі, турызму Беларусі і ўсіх краін-удзельніц. Беларусь мае ўсё неабходнае, каб правесці Еўрапейскія гульні на якасным узроўні: развітая спартыўная інфраструктура, багаты вопыт правядзення міжнародных спаборніцтваў высокага ўзроўню, кваліфікаваныя спецыялісты, а таксама ўсебаковая падтрымка з боку Прэзідэнта Беларусі, прэзідэнта НАК Аляксандра Лукашэнкі»,* — расказаў міністр спорту.

Старшыня Каардынацыйнай камісіі ЕАК таксама падкрэсліў неабходнасць прыцягнуць да выступленняў на турніры як мага большую колькасць топавых атлетаў, каб зрабіць прадстаўленыя віды спорту яшчэ больш цікавымі. Тым больш што ў ходзе спаборніцтваў будуць разыграны ліцэнзіі на Алімпіяду ў Токіа. *«Барацьба на спортпляцоўках у Мінску ў 2019 годзе чакаецца гарачая. Рады, што на ІІ Еўрагульнях будзе прадстаўлена каратэ, якое ўвайшло ў алімпійскую праграму 2020 года, і турнір у Мінску стане выдатнай рэпетыцыяй. Будзе прадстаўлены баскетбол 3х3, якога не было на першых Еўрапейскіх гульнях. ЕАК падтрымаў Міжнародны алімпійскі камітэт у імкненні ўключыць гэтыя віды ў праграму спаборніцтваў»,* — адзначыў Спірас Капралас.

Удзельнікі каардынацыйнай камісіі наведалі шматфункцыянальны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна» і спартыўна-забаўляльны комплекс Falcon Club, якія будуць задзейнічаны падчас Еўрагульняў.

Візіт камісіі будзе доўжыцца да 23 верасня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

**Усё, што вы хацелі даведацца аб працоўным праве**

Тэлефануйце на прамую лінію гасцям рэдакцыі «Звязды» — юрыстам, **галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ**.

**25 верасня з 11.00 да 13.00** па тэлефоне **8 (017) 287-18-71**.

Папярэднія пытанні можаце задаць **сёння, 22 верасня** па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

### ДРУК СЫХОДЗІЦЬ У ГІСТОРЫЮ

**Усе друкарні і рэдакцыі газет Гомельскай вобласці прынялі ўдзел у зборы экспанатаў для музея друку, які адкрыўся ў абласным цэнтры.**

— Новая экспазіцыя музея пакажа вытокі нашай памяці, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАЎГАЛА**. — Мы зможам вярнуцца ў мінулае, дакрануцца да яго. Цяпер не толькі ў архівах і на інтэрнэт-рэсурсах мы зможам бачыць, як некалі ажыццяўляўся друк газет і іншай паліграфічнай прадукцыі.


**Галоўны рэдактар газеты «Гомельская праўда» Сяргей БЯСПАЛЫ друкуе так, як гэта рабілі 100 гадоў таму.**

Гамяльчане і госці горада цяпер на свае вочы могуць пабачыць абсталяванне, якое зусім нядаўна, гадоў трыццаць таму, яшчэ актыўна выкарыстоўвалася, а сёння заняло пачэснае месца сярод музейных экспанатаў. Рарытэтамі сталі ручная друкавальная машына, прэсы, наборныя касы з рэаламі... З дапамогай аналагічных прылад сто гадоў таму пачынала друкавацца і «Звязда». Сёння тэхналогію першай паловы XX стагоддзя можна паспрабаваць паўтарыць і самому выканаць ручны набор аўтарскага экзэмпляра тэксту пры дапамозе шрыфту, які складаецца з люстраных друкаваных знакаў — літар. Ці, выкарыстоўваючы ручны прэс, атрымаць адбітак з лінагравюры.

У экспазіцыі таксама прадстаўлены ўнікальныя дакументы і фатаграфіі, калекцыя стацыянарных і партатыўных пішучых машынак, а таксама своеасаблівыя «біяграфіі» газет рэгіёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### СУДОВЫЯ ЭКСПЕРТЫ ПРЫНЯЛІ ПРЫСЯГУ

**Урачыстая цырымонія прайшла ў Зале Перамогі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 19 маладых афіцэраў, якія неўзабаве пачнуць работу ў якасці судовых экспертаў, кляліся добрасумленна выконваць сваю справу. Бо ад іх сумленнасці і аб'ектыўнасці будуць залежаць лёсы людзей. Высвятленне ісціны па любой справе — крымінальнай, грамадзянскай, гаспадарчай — немагчымае без аб'ектыўнай экспертызы.**

— Гэта знакавая падзея ў іх жыцці, — сцвярджае **старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй ШВЕД**. — Трэба сказаць, што прэстыж нашай службы з кожным годам расце. Для гэтага ствараюцца і неабходныя ўмовы. На большасць спецыяльнасцяў, па якіх праходзяць службу будучыя афіцэры, мы прымаем людзей па конкурсе. Напрыклад, у акадэміі МУС ён складаў 3—4 чалавекі на месца.

Стаць судовым экспертам не так і проста. Мала мець спецыяльную адукацыю, прайсці тэсціраванне і займець належную фізічную падрыхтоўку. Трэба яшчэ здаць адмысловы іспыт. І толькі пасля гэтага малады спецыяліст прыступае да работы. Але сама менш першыя дванаццаць месяцаў кожны яго крок будуць кантраляваць старэйшыя калегі. І толькі прыкладна праз паўтара года пасля атрымання дыплома судовы эксперт атрымае права самастойна праводзіць даследаванні. Патрабаванні, як бачна, жорсткія. Але і адказнасць вельмі вялікая. Адметна, што праца судовага эксперта не лічыцца выключна мужчынскай. Словы прысягі, сярод іншага, прагучалі з вуснаў пяці дзяўчат.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### ДАЙ ДАРОГУ ВЕЛАСІПЕДУ!

**Настаўнікі і выкладчыкі ўстаноў адукацыі Наваполацка 22 верасня перасядуць на веласіпеды. Чакаецца, што карысны ва ўсіх сэнсах спосаб перасоўвання падтрымае не адна сотня работнікаў адукацыі.**

Такім чынам педагогі вырашылі паказаць сваім вучням і студэнтам, што самі яны ў добрай фізічнай форме, а веласіпеды існуюць не толькі для юнакоў. Акцыя пройдзе ў межах Еўрапейскага тыдня мабільнасці, каб падтрымаць магчымасці менш шкоднага ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем. Іншыя мерапрыемствы тыдня, скіраваныя на моладзь, — Дзень жывой вуліцы, заняткі «Дзеці ў руху», флэшмоб «Горад, зручны для жыцця», конкурс мастацкіх блакнотаў «Транспарт будучыні» і дзіцячай творчасці «Азбука дарог», акцыя «Трамвайны вагон» — прыцягваюць увагу менавіта да тэмы экалагічнага транспарту. На гэту пятніцу запланавана і акцыя «Веладзорава» Полацкага дзяржуніверсітэта, паведамілі ў Наваполацкім гарвыканкаме.

### АЛЕЯ Ў ПАДАРУНАК

**Маладыя навапалачане пасадзяць алею туй і ўстановяць на ёй памятны знак у гонар 15-годдзя грамадскага аб'яднання «БРСМ».**

Час для пасадкі — самы той, а выдзеліць каля сотні дрэўцаў мясцовая лясная гаспадарка. Месца для алеі таксама ўжо вызначана, узгадняюцца некаторыя тэхнічныя моманты. Як паведамілі ў Наваполацкім гарвыканкаме, ініцыятыва нарадзілася ў межах апошняй дыскусійнай пляцоўкі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Ці лёгка быць маладым?». Дзве каманды, з аднаго боку — прадстаўнікі парламента дзяцей і навучэнцаў Наваполацка, а з другога — працоўная моладзь і актыў Наваполацкай гарадской арганізацыі БРСМ, разважалі не толькі над тым, як далучыцца да добраўпарадкавання горада, але і над пытаннямі прафарыентацыі, атрымання вышэйшай адукацыі. Закранулі і «вечныя» тэмы: хто можа звацца сёння лідарам, якімі вартасцямі трэба валодаць, каб павесці за сабой? Прадстаўнікі абедзвюх камандаў сышліся на тым, што самым важным застаюцца сумленнасць, шчырасць, паважлівасць.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ■ Надвор'е

# ВЫХАДНЫЯ БЕЗ ДАЖДЖОЎ

**Тэмпература паветра ў трэцяй дэкадзе верасня чакаецца на 1—2 градусы вышэйшая за норму**

**Па-восеньску цёпла і пераважна без ападкаў будзе ў Беларусі ў выхадныя, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Сёння ўдзень надвор'е ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплая паветраная маса, якая паступае з боку паўднёвага ўсходу. Пераважна па паўднёвым захадзе краіны пройдуць дажджы. Днём месцамі чакаюцца навальніцы. На большай частцы тэрыторыі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра складзе ад 20 да 26 градусаў, па захадзе будзе 15—19 цяпла. Далей з-за скандынаўскага антыцыклону, які стане паступова ўзмацняць свой уплыў над надвор'ем, усталюецца малавоблачнае камфортнае надвор'е. Уначы і раніцай будзе па-асенняму халаднавата, а дзённая тэмпература часцяком дасягне 20-градуснай мяжы.

Ужо ў суботу чакаецца пераважна без ападкаў, толькі па поўдні пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—13 градусаў, удзень — ад 15 да 22 цяпла. Не абяцаюць у асноўным ападкаў і ў нядзелю, толькі ў некаторых раёнах па паўднёвым захадзе Беларусі магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Чакаецца, што тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў, а ўдзень будзе 14—21 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак прагназуецца пераважна без ападкаў, уначы ў крайніх паўднёва-заходніх раёнах магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 6 да 13 градусаў, удзень — 14—21 цяпла. Чакаецца, што пераважна без ападкаў будзе ў аўторак і сераду. Крыху пахаладае. Тэмпература паветра ўначы складзе ўсяго 4—11 цяпла, удзень чакаецца каля 12—19 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ■ На слыху

# ГРЫБНІКОЎ ШУКАЮЦЬ НЕ ПЕРШЫЯ СУТКІ

**А аматарак журавін уначы занесла да возера Чортава**

**У трох раёнах Віцебскай вобласці не першыя суткі шукаюць грыбнікоў, якія заблудзілі.**

Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, пенсіянераў, якія згубіліся ў лясных масівах 18 і 19 верасня, шукаюць у Шаркаўшчынскім, Ушацкім і Гарадоцкім раёнах. Ратавальнікі рэкамендуюць грыбнікам выконваць простыя правілы: не адпраўляцца ў лес у адзіночку, надзяваць зручныя, яркія, непрамакальныя вопратку і абутак, узяць з сабой компас, тэлефон, ваду, лекі, нож, запалкі. Неабходна таксама паведаміць сваякам або знаёмым пра меркаваны маршрут і час вяртання. Калі заблудзілі — нельга панікаваць. Пры наяўнасці тэлефона трэба набраць нумар службы МНС альбо міліцыі. Калі апынуліся ў лесе без тэлефона, галоўнае — выйсці да людзей. Важнымі арыенцірамі будуць лініі электраперадач, прасекі і сцяжынкі. Выявіўшы любы з гэтых аб'ектаў, неабходна ісці ўздоўж яго.

Жыхаркі Гродна выправіліся ў лес не ў грыбы, а ў ягады. І таксама заблудзілі і правялі ноч у прыгранічнай зоне. Як паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, тры жанчыны 20 верасня адправіліся ў пагранічную зону для збору журавін. Ужо ўвечары, сабраўшы поўныя кошыкі, яны зразумелі, што страцілі арыенціроўку на мясцовасці, і патэлефанавалі знаёмым з просьбай аб дапамозе, якую тыя своечасова перанакіравалі на пагранічны пост. Сувязь з жанчынамі, якія, як высветлілася, знаходзіліся каля возера Чортава, падтрымлівалі з дапамогай мабільнай сувязі. Раніцай 21 верасня вайскоўцы пагранпаста, пагранічнай камендатуры «Парэчча» сумесна з ратавальнікамі і міліцыяй непадалёк ад вадаёма знайшлі ўсіх трох аматарак лясных ягад.

А восць лёс зніклага ў суботу 16 верасня ў Белавежскай пушчы 10-гадовага хлопчыка, якога шукаюць некалькі сотнень людзей, на момант падрыхтоўкі матэрыялу заставаўся нявызначаным...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Што летам уродзіцца...



Галіна ЗІНЕВІЧ чэша лён на шчотцы з жалезнымі зубамі, выробленай у 1920 годзе і падоранай клубу Марыяй Дзям'янаўнай ГУРЫН. З пакулля, што заставалася на зубах шчоткі, пасля рабілі лялек. Перад жанчынай — церніца, якую клубу падарыла Яўгенія Іванаўна КОПАЦЬ. А крыжападобная прылада, на якую намотвалі ніці, называецца казёл.

## ПАСЕЕШ ЛЁН — ПАЖНЕШ ЗОЛАТА

Нашы прадзеды казалі «лён любіць паклон», падкрэсліваючы цяжкую і доўгую працу з гэтай раслінай. Сеялі яго ў пачатку лета, напрыканцы жніўня рвалі ды вязалі ў снапы. З першым снегам лён мялі, каталі ў кудзелю і пралі ў ніці. І толькі па вясне ткалі.

Лён-фэст, які зладзілі ў вёсцы Цінявічы на Карэлічыне, атрымаўся па народнаму каларытным і гістарычна-пазнавальным. Госці пабачылі, як калісьці нашы продкі з абрадавымі песнямі рвалі лён і вязалі яго ў снапы.

— З гэтых снапоў незамужнія дзяўчаты бралі шэсць сцяблінак. Сціскалі ў руцэ пасярэдзіне і ніткай абвязвалі з канцоў пучка па дзве сцяблінкі. Калі абодва канцы супадалі — гэта была прыкмета да шлюбу, — расказала **Наталля ГАРОДНІК, дырэктар Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.**

Што рабілі з раслінай далей, можна было ўявіць, паглядзеўшы на выстаўку сельскіх прылад. **Галіна ЗІНЕВІЧ, акампаніятар сектара «Баранавіцкі сельскі клуб»** паказала, як на церніцы лён церлі, пасля трапалі яго трапалом, часалі на драўляных ці жалезных шчотках. Усе рэчы сапраўдныя, іх збіралі па хатах ад людзей, якія захавалі спадчыну сваіх бацькоў і дзядоў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Наталля ДАСЬКО, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Карэлічы-Лён»** расказала, што іх прадпрыемства вырабляе дзясяткі відаў доўгага і кароткага льновалакна для розных тканін, ільняны шпагат, ільняны алей. А адносна нядаўна пачалі выпускаць паліўны брыкет з ільну.

Арганізатары свята падрыхтавалі сюрпрыз для сям'і ЧЫЧКАН. Яўген і Вікторыя нядаўна адзначылі льняное вяселле — чатыры гады. Сімвалічны падарунак ім уручыла **Іна САНЧУК, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама, старшыня раённай арганізацыі ГА «БСЖ»,** якая расказала, што льнаводства — адна з галоўных галін сельскай гаспадаркі раёна.

— Кветкі льну на гербе Карэліч — своеасаблівы сімвал нашай мясцовасці. З валакна ткалі палатно, стваралі прадметы побыту, майстравалі цацкі. Лён — кашуля ў полі, казалі даўней.

Усе ахвотныя маглі вырабіць сямейны абярэг — ляльку-мотанку ў выглядзе хлопчыка і дзяўчынкі, сплеценых коскай.

— Усе абярэгі не шыюцца, а матаюцца з ільняных ніцяў з дабаўленнем чырвонай ніткі. Немаўлятам яны вешаюцца на руку, ад сурокy ў хаце яны вешаюцца пры дзвярах, — растлумачыла **Юлія БАЯРЭНКА, загадчык аддзела рамесніцкай дзейнасці «Раённы Дом рамёстваў».**

За мяжой падарунак з ільну лічыцца дарагім прэзентам і вельмі цэніцца, упэўнена



У Астраўцы вырасла асаблівая дуброва!

**Марына БАНІФАЦЬЕВА, майстрыха з Кобрына,** якая на свята прывезла свае вырабы: вышываныя льняныя сукенкі, кашулі, цацкі, сурвэткі. Яе майстэрства добра ведаюць не толькі дома, але і далёка за межамі краіны: у Расіі, Італіі, Германіі, Іспаніі, Грэцыі. Шыць жанчына пачала гадоў 15 назад.

— Спачатку шыла царкоўную адзежу, у тым ліку і з ільну, яе дагэтуль носяць яшчэ. Пасля знаёмыя сталі рабіць замовы. Я паспрабавала — цяпер адзін від кашуль шыю адразу: ад 39-га да 48-га памеру па каўнерыку, — смяецца яна. — Людзі вяртаюцца да льняных тканін. Вырабы з іх сапраўды прыгожыя, і прасаваць іх не так цяжка, як думаюць, — дастаткова недасушыць крыху пасля мыцця. Некаторыя носяць лён і ўзімку, і я ў тым ліку. Калі ўжо пасадзіў у льне, складана вярнуцца да звычайнага адзення.



Памідор — кароль свята ў Іўі.

Госці свята змаглі не толькі паслухаць пра лён і пабачыць, што з яго можна рабіць, але і паўдзельнічаць у конкурсах на стварэнне лепшага абярэгу і пляценне самай прыгожай касы з ільну, паспрабаваць сябе ў скоках у льняных мяхах і ў матанні ў клубок ільняной ніці. А таксама пачаставацца кісялём з ільнасеменем з дабаўленнем мёду і брусніц ды крэкерамі з ільнасеменем.

**Аляксандр ВЯРСОЦКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:** «Сёлетнія побытавыя мерапрыемствы ў Гродзенскай вобласці — вынік жадання, каб на тэрыторыі раёнаў прыжыліся святы, звязаныя з традыцыямі мясцовасці. Напрыклад, «Ганненскі кірмаш», які ў Зэльве аднавілі не так даўно, праводзіўся тут яшчэ некалькі стагоддзяў таму. Аднак шэраг раёнаў да сёння не мелі сваіх свят, хоць ім ёсць чым пахваліцца. Уся Беларусь і нават замежнікі ведаюць, дзе растуць найлепшыя беларускія памідоры, таму фестываль «Іўеўскі памідор» удала падкрэсліў гэтую ідэю. А Смаргоншчына, сусветна вядомая сваімі абаранкамі, — адна з першых мясцін, дзе пачыналі гатаваць гэты ласунак, а, можа, не выключаю, адсюль яны і пайшлі.

Упэўнены, што ўсе гэтыя фестывалі з году ў год будуць набіраць абароты. Для Гродзенскай вобласці гэта значыць, што рэгіёны сталі яшчэ больш прывабнымі для турыстаў. Ну і канешне, гэта даніна павагі традыцыям мінуўшчыны і людзям, якіх мы ўспомнілі і якім падзякавалі за тое, што яны калісьці рабілі».

## ЖАЛУДОВАЯ КАВА І ДУБ З МЕТАЛАЛОМУ

У старадаўнія часы ў адной мясцовасці людзі пакланяліся дубу і чараўніку. Зняважаны такім стаўленнем Пярун пакараў іх. Дрэва і чараўніка — знішчыў, а людзей ператварыў у камяні. Гэтую легенду на свяце, прысвечаным сімвалу Астраўца — дубу, што змешчаны на гербе горада, мясцовыя бібліятэкары «ажывілі» ў тэатралізаваным прадстаўленні.

Іншыя незвычайныя мерапрыемствы таксама датычыліся віноўніка ўрачыстасці — дуба. Гэтае дрэва было зроблена і з металалому, і з паперы, і з булачкамі замест лісця. На фотавыстаўцы-конкурсе «Дуб у аб'ектыве» найлепшы здымак вызначаўся ў трох намінацыях: «Сэлфі з дубам», «Прыгажосць і моц дуба» і «Сямейнае дрэва». 200 работ 44 удзельнікаў настолькі ўразілі арганізатараў і гасцей свята, што выстаўку вырашана было зрабіць перасовачнай, каб яе змаглі пабачыць жыхары навакольных вёсак.

Гарадскі лясны парк упрыгожыўся аб'ёмнымі фігурамі, якія сімвалізавалі дуб. Тут жа прайшоў пленэр рэзчыкаў па дрэве бензапіламі, якія на вачах у гледачоў магутнымі прыладамі стваралі фантастычныя драўляныя вырабы. А непадалёк ад Астраўца высадзілі новую дуброву з маладзенькіх дрэўцаў.

Госці свята змаглі паўдзельнічаць у квэст-гульні «У пошуках дуба» і падсілкавацца ў «Жалудовай кавярні» кавай з жалудоў і кісялём з яе, блінамі з жалудовай мукі ды малочным жалудовым супам.



Такія цудоўныя і адметныя стравы з бульбы згатавалі мясцовыя гаспадыні.

## ЦЮЛЬПАНЫ З ПАМІДОРАЎ І БУЛЬБЯНЫ БУМ

Галоўным героем свята ў Іўі быў памідор. Таматны касцюм апрануў ледзьве не кожны: ад удзельнікаў святочнага шэсця да гандляроў у палатках. Падчас мерапрыемства закаталі сімвалічны слоік з новым ураджаем памідораў. Згатавалі трохметровы бутэрброд з памідорамі і «цюльпаны» — памідоры з начынкай са сцяблінамі з пер'я цыбулі.

Сімвал жыцця і працы хлеб, а таксама працу хлебаробаў славілі на свяце хлеба ў аграгарадку Малюшычы, што на Карэліччыне. Падчас мерапрыемства госці змаглі навучыцца вязаць снапы з калосся, ляпіць арыгінальныя фігуркі з цеста і масцікі і танцаваць побытавыя танцы. Усе ахвотныя частаваліся свежай выпечкай і фатаграфаваліся ў адзенні пекара і хлебароба.

А ў мінулыя выхадныя Карэліцкі край ушаноўваў «другі хлеб» у аграгарадку Ярэмічы. Пачэснай госцяй свята была, вядома, бульбачка. Персанаж у адмысловым касцюме бульбы, створаным спецыяльна да мерапрыемства мясцовай майстрыхай, вадзіў карагоды, сачыў за конкурсам, як правільна саджаць бульбу, і проста весяліў гасцей. Стравамі з бульбы на конкурсе «Бульбяны бум» — дранікамі з мясам, бульбянымі піражкамі ды мініяцюрнымі кошычкамі з бульбін з грыбамі — частавалася не толькі журы, але і ўсе прысутныя.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*
**Фота аўтара, Івана ДЗЯТЛОВІЧА і БЕЛТА.**

# НАВОШТА НАМ ДОЛАРЫ?

## Норма абавязковага продажу замежнай валюты зніжана да 10%

Нацыянальны банк зрабіў яшчэ адзін крок, накіраваны на лібералізацыю беларускай фінансавай сістэмы. З 1 кастрычніка будзе зніжана норма абавязковага продажу замежнай валюты суб'ектамі гаспадарання да 10%.

— Нагадаем, што ў розны час нарматыў абавязковага продажу валюты мяняўся ў дыяпазоне ад 30% да 50% (увосень 2014 года), — кажа **Міхаіл ГРАЧОЎ, фінансавы кансультант TeleTrade.** — Першапачаткова абавязковы продаж замежнай валюты суб'ектамі гаспадарання ўводзіўся ў канцы 90-х — пачатку 2000-х гадоў рознымі нарматыўнымі актамі. Усе ўдзельнікі знешнеэканамічнай дзейнасці абавязваліся прадаваць частку валютнай выручкі па курсе Нацбанка ў вызначаных нарматыўнымі актамі аб'ёмах. Мэтай гэтага рэгулявання была падтрымка абменнага курса беларускага рубля шляхам папаўнення дзяржаўных рэзерваў, якія фарміраваліся Нацыянальным банкам. Але гэта стварала дэфіцыт валюты на ўнутраным рынку, што ў асобныя моманты прыводзіла да ажыятажнага попыту на валюту, асабліва з боку фізічных асоб, і правакавала чаканне дэвальвацыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Далей ва ўмовах пастаяннага росту абменнага курсу і нестабільнага валютнага рынку экспарцёры неслі курсавыя страты. Акрамя таго, паколькі дэвальвацыйныя чаканні закладваліся ў канчатковую цану экспартуемых тавараў і прадуктаў, гэта зніжала іх канкурэнтаздольнасць. І толькі пасля стабілізацыі ўнутранага валютнага рынку Нацбанк пайшоў на паступовае зніжэнне гэтай велічыні да бягучых значэнняў.

Новы паказчык нарматыву абавязковых продажаў замежнай валюты красамоўна сведчыць аб стабільнасці абменнага курса беларускага рубля, напаўненні ўнутранага валютнага рынку і зніжэнні дэвальвацыйнага чакання для ўсіх удзельнікаў рынку. Таксама гэты факт паслужыць добрай дапамогай для экспартна арыентаваных галін нацыянальнай эканомікі.

Дэфіцыт замежнай валюты на ўнутраным рынку малаверагодны, бо рэзервы Нацбанка цяпер знаходзяцца на гадавых максімумах з 2014 года. Банкаўскі сектар Беларусі таксама не адчувае дэфіцыту замежнай валюты. Аб'ёмы таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы цалкам задавальняюць патрэбнасць унутранага рынку ў валюце. Такім чынам, уводзімы з 1 кастрычніка нарматыў абавязковага продажу толькі будзе спрыяць стабілізацыі абменнага курса беларускага рубля.

Высокая верагоднасць, што да канца бягучага 2017 года або ў пачатку наступнага Нацбанк поўнасцю адменіць нарматыў абавязковага продажу. Гэта стане добрай нагодай для ўмацавання даверу да нацыянальнай валюты і росту экспартнага патэнцыялу эканомікі Беларусі.

## Справа не толькі ў працэнтах

Што датычыцца валюты як сродку назапашвання, па доларавых дэпазітах банкі сёння прапануюць людзям да 2% гадавых. Гэта максімум, які прадугледжвае безадзыўны фармат укладу на 2 гады. Часам у невялікіх прыватных банках могуць узнікаць валютныя прадукты з нефіксаванай даходнасцю нават да 2,5% гадавых, але ў гэтых выпадках існуе вялікая верагоднасць, што ўжо праз месяц працэнты сур'ёзна падрэжуць у аднабаковым парадку. Па валютных укладах на тэрмін каля года ці ў адзыўным варыянце банкамі прапануецца ад 0,7 да 1% гадавых. Кароткія валютныя дэпазіты (ад 35 да 185 дзён) будуць мець даходнасць ужо менш за 1% (звычайна 0,3—0,6%) гадавых. Увогуле, практычна ўсё мае знаёмыя новыя уклады ў валюце не адкрываюць. І справа тут не толькі ў маленькіх працэнтах. Асноўная замежная валюта (USD і еўра) за апошні год нават патаннела.

## Валютныя аблігацыі «зваліліся»

Яшчэ летась каштоўныя паперы ў валюце прыносілі іх уладальнікам нядрэнны даход. Уласныя валютныя аблігацыі сістэмных банкаў краіны прадугледжвалі спачатку 5,5%, а потым 5% гадавых. Сёння падобных каштоўных папер з такой даходнасцю ўжо няма. Цяпер існуюць толькі валютныя аблігацыі на прад'яўніка ў некаторых банках, але ўжо пад 3,5% гадавых. Праўда, на фінансавым рынку з'явіліся бездакументарныя каштоўныя паперы таго ці іншага гандлёвага гіганта. Прапануюцца яны ў валюце пад 7,5% гадавых і на тэрмін 10 гадоў. А гэта ўжо вялікі мінус. Існуе там і датэрміновае пагашэнне такіх папер, але гэта будзе каштаваць іх уладальніку пэўных дадатковых выдаткаў. У насельніцтва яны пакуль вялікай папулярнасцю не карыстаюцца. Людзей сёння палохае той факт, што па гэтых каштоўных паперах у іх на руках ніякіх папяровых дакументаў не застаецца. А калі няма гэтай самай паперы, то і ў кліентаў часам узнікае ўражанне, што гарантыя вяртання іх грошай не зусім відавочная.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Стоп, знята!

# Ігар Сігоў пра Галівуд, тэатр і Понція Пілата

**Тэатр і кіно — з'явы хоць і падобныя, але ў такой жа ступені розныя. Для акцёраў гэта не перашкода: тэатральныя артысты лёгка пераходзяць у кінематограф і наадварот. Іншая справа — ці атрымаецца ў іх дасягнуць на іншай пляцоўцы такога ж поспеху, як на сваёй? У Ігара Сігова гэта атрымалася: акцёра ведаюць па ролях у тэлесерыялах і кінафільмах, у спектаклях «Адвечная песня», «Чайка» ды дзясятку іншых, па ўласных пастаноўках у якасці рэжысёра, былога дырэктара РТБД, а яшчэ — як першага беларускага кінаакцёра, якому давялося ўбачыць на ўласныя вочы знакамітую цырымонію «Оскар».**

***— Ігар, роляў у кіно ў вас вельмі шмат (каля 100), здаецца, нават больш, чым на тэатральнай сцэне. Што прыводзіць акцёра тэатра ў кінематограф?***

— Калі я выпускаўся з ВНУ, у дыпломе было напісана «акцёр драмы і кіно», то-бок гэта мой прамы абавязак. Чаму не ўсе прыходзяць у кіно? Мяркую, гэта пытанне кшталту «падабаецца ці не», раней амаль усе ішлі працаваць у тэатры. Гэта сёння многія імкнуцца трапіць у кіно, і відавочна чаму: гэта выгадна з фінансавага боку. Апошнім часам заробкі і ў кіно паменшыліся, але калі параўнаць, то адзін здымачны дзень — гэта паўмесяца працы ў тэатры. Вядома, гэта датычыцца акцёраў з досведам. Я прыйшоў у кіно, калі яго яшчэ ў нас здымалі (маю на ўвазе вялікія мастацкія стужкі, а не серыялы). І прывялі мяне сюды менавіта жаданне і магчымасць самарэкламы: ёсць выраз «прачнуцца знакамітым». Памятаю свае першыя здымкі: тады мой ганарар складаў 5 долараў!

> **«У кінематографе ёсць мантаж і агучка, можна фільм «выцягнуць», у тэатры такога не будзе — яго немагчыма прыпыніць».**

***— Вы здымаліся і ў серыялах. Ці лічыце гэта сур'ёзнымі кінаработамі?***

— Калі казаць пра серыялы, якія мне падаюцца якасна зробленымі, я адзначыў бы першыя сезоны «Вуліцы разбітых ліхтароў» ці ўкраінскі «Слуга народу». Яны атрымаліся ўдалымі, хоць, вядома, і там ёсць недахопы. Серыял — гэта ў першую чаргу тэлевізійны праект, разлічаны на масавага гледача, таму здымаецца вельмі хутка, сцэнарый прапісаны проста, нават схематычна. Словам, да гэтага нельга ставіцца як да сур'ёзнага кінатвора. Я і сам здымаўся ў серыялах і думаю, што нават у такіх праектах павінна быць ідэя: дзеля чаго ўсё гэта ствараецца?

***— Якіх герояў вам падабаецца іграць больш?***

— Большасць маіх роляў у кіно — адмоўныя персанажы. І для мяне вышэйшы камплімент, калі глядач адчувае нянавісць да гэтага героя. Думаю, калі за акцёрам бачаць у першую чаргу яго героя, то роля атрымалася. Вось толькі не ведаю, чаму акцёрам, якія іграюць адмоўных персанажаў, не даюць узнагароды... Здаецца, толькі ў Хопкінса атрымалася: яму далі «Оскар» за стужку «Маўчанне ягнят». У асноўным жа слава дастаецца станоўчым героям! Артысты больш любяць іграць адмоўных персанажаў, бо гэта цікава з прафесійнага пункту гледжання: роля разнапланавая. Я, вядома, люблю ўсіх герояў, мае выкладчыкі казалі, што трэба шукаць станоўчае ў адмоўным і наадварот, тады героі будуць аб'ёмнымі. Вось, напрыклад, Понцій Пілат: неадназначная асоба ў гісторыі, тым больш датычна рэлігіі наогул увасабленне зла. Але ці так гэта насамрэч? Ён тры разы намагаўся дапамагчы Іешуа. Усё залежыць ад таго, з якога боку паглядзець на героя: на чыноўніка, які кіруецца абавязкам, ці на чалавека?

***— Кароткаметражная стужка «Дзверы», якая намінавалася на «Оскар», знятая на аснове адной з гісторый «Чарнобыльскай малітвы». Цяпер яна стала яшчэ больш каштоўнай, бо Алексіевіч атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Што адчувалі падчас працы над гэтым фільмам?***


Кадр з фільма «Дзверы» (рэж. Х. Уілсан).

— З Алексіевіч упершыню сустрэўся, калі працаваў у РТБД, мы працавалі над спектаклем «Чарнобыльская малітва». Гэта быў нават не спектакль, а маналог лёсаў, якія мы рэпеціравалі паасобку, то-бок не чулі іншых герояў. Калі ж сабраліся разам і паслухалі маналогі адзін аднаго, гэта было нешта неверагоднае: мы дзяліліся перажываннямі і спрабавалі данесці трагедыю, бо складана было перадаць, што адчувалі нашыя героі. Пасля ірландскія кінематаграфісты зрабілі паводле аднаго з эпізодаў «Чарнобыльскай малітвы» фільм «Дзверы». Дарэчы, там я іграў іншага героя, чым у спектаклі. А ўрывак са стужкі быў мне знаёмы, я ведаў яго на памяць, прычым разумеў сітуацыю: у мяне таксама ёсць дачка, я мог уявіць, што азначала б страціць яе. Стужку знялі за 7 дзён, адзін з іх мы правялі ў горадзе Прыпяць. Здымалі ў Зоне адчуджэння, атмасфера была настолькі страшная, што некалькі гадзін здымачная група хадзіла ў цішыні і разглядала пусты горад. Тады яшчэ я пажартаваў, што гэта выдатны павільён для здымак кіно. Так, атмасфера адзіноты і смяротнай цішыні праследавала нас, але калі падумаць, што там таксама жылі людзі, калі паглядзець на іх прозвішчы на дзвярах пад'ездаў, то станавілася больш спакойна. Мяне вельмі ўразіў момант, калі ўбачыў на прыступках разбіты раяль: гэта быў вобраз гуку сярод працяглага маўчання.

***— На «Оскары» вы адчулі атмасферу амерыканскага кінажыцця. Як яно адрозніваецца ад нашага?***

— Галівуд — гэта краіна кіно, там гэта не пусты гук, а сэнс жыцця. Тыя, хто там жыве, не проста любяць кінематограф, яны фанаты. І кінаіндустрыя таксама там працуе на гледача, якому надае шмат увагі. Іншае пытанне — наколькі важны для іх «Оскар»? Да гэтай прэміі па-рознаму ставяцца, яна выклікае шмат дыскусій, але дакладна — гэта маральнае заахвочванне кінематаграфічнага таленту. І кіно там у большасці масавае, яно павінна забаўляць. Гэта не вельмі добра, бо наш глядач перастаў разважаць над стужкамі, не хоча глядзець артхаус ці пафіласофстваваць над «Сталкерам» Таркоўскага. Гэта я кажу да таго, што стаўленне да кіно ў Амерыцы і Беларусі розныя. Калі бачыш «Оскар» па тэлебачанні, то дзея ўяўляецца вельмі пампезнай, але, калі ты прыязджаеш туды, разумееш, што гэта для іх не пафас, а норма. Памятаю, як штосьці падобнае спрабавалі зрабіць на «Лістападзе», і было заўважна, як няёмка акцёрам, як ненатуральна гэта выглядае ў нашых рэаліях. Там гэта не шоу, а іх рэальнае кінематаграфічнае жыццё: акцёры дыскутуюць, для іх гэта проста сустрэча са старымі знаёмымі. У нас на кінафестывалях увага звяртаецца часам не на нашых акцёраў і рэжысёраў, а на запрошаных замежных гасцей (часам было ўражанне, што мерапрыемства ствараецца не дзеля свята самога кіно, а зусім з іншымі мэтамі).

***— Пасля «Оскара» жыццё акцёра змяняецца: шмат прапаноў, ужо іншыя ганарары?..***

— Я сказаў бы, што ў першы час пасля паездкі на «Оскар» акцёрскіх прапаноў паменела! Думаю, спрацавалі стэрэатыпы, што калі акцёр быў на такім фестывалі, то яго кошты павялічваюцца. Але гэта не так. Наогул, нічога пасля гэтай паездкі не змянілася: таленту не пабольшала, але з'явілася ўпэўненасць і разуменне таго, што ўсе знакамітыя людзі — такія ж самыя, як і мы, проста ў іх іншыя ўмовы, але праблемы такія ж. Думаю, гэтая падзея дала мне ў творчасці яшчэ і апірышча, што беларускі акцёр у прафесійным плане можа быць яшчэ больш цікавым і разнапланавым, чым галівудскія артысты, якія часта застаюцца ахвярамі свайго амплуа.

> **«Калі бачыш «Оскар» па тэлебачанні, то дзея ўяўляецца вельмі пампезнай, але, калі ты прыязджаеш туды, разумееш, што гэта для іх не пафас, а норма. Памятаю, як штосьці падобнае спрабавалі зрабіць на «Лістападзе», і было заўважна, як няёмка акцёрам, як ненатуральна гэта выглядае ў нашых рэаліях».**

***— Чым адрозніваецца праца акцёра над фільмам і спектаклем?***

— Спектакль — гэта жывы арганізм. Кожны раз акцёр выходзіць іграць яго па-новаму. Калі паказы ідуць цягам доўгага часу, ён паспявае пераасэнсаваць лёс свайго героя, паглыбіцца ў вобраз. У кіно ты проста чуеш «Стоп! Знята!» і больш нічога не можаш выправіць ці змяніць: на экране будзе бачна, на колькі працэнтаў акцёр выклаўся на здымачнай пляцоўцы. Але ў кінематографе ёсць мантаж і агучка, можна фільм «выцягнуць», у тэатры такога не будзе — яго немагчыма прыпыніць. Што датычыцца працы з рэжысёрамі ў кіно і тэатры, то яна вельмі падобная. Адзінае — што ў тэатры рэжысёр звяртае ўвагу на тое, як акцёр працуе над вобразам, дапамагае яму ўжыцца ў ролю сапраўды глыбока. Я ведаю, што кінарэжысёр таксама можа паставіць спектакль, хоць тэатр — гэта ў большай частцы ўмоўнасці і знакі, таму часам кінематаграфісту бывае складана, ён спрабуе працаваць, як на здымачнай пляцоўцы.

***— Вы працавалі дырэктарам РТБД 2 гады. Чым была карысная гэтая праца для вас як для творчага чалавека?***

— Калі я займаў гэтую пасаду, даводзілася прымаць розныя рашэнні. Часам і тыя, якія прымаць не хацелася. Гэта якраз той момант, калі мы кажам пра справу выбару паміж чалавечым разуменнем і працоўным абавязкам. Але, безумоўна, гэта было для мяне карысным: я ўбачыў другі бок медаля, даведаўся пра многія законы, якія цяпер магу выкарыстоўваць, каб абараніць сябе як акцёра і як чалавека. Мне хапіла двух гадоў, каб зразумець, што такое чыноўнік, і каб зразумець, што я ім быць не хачу. Гэта паўплывала і на творчасць: цяпер у мяне ёсць крыху іншыя разуменні некаторых персанажаў.

***— Вы казалі, што хацелі, каб РТБД быў эксперыментальным тэатрам. А самі якой рэжысуры аддаяце перавагу: аўтарскай ці класічнай?***

— Стаўлюся да аўтарскай рэжысуры так, як да артхауснага кіно. Так, я за аўтарскую рэжысуру, але яе ўзровень павінен быць высокім. Да таго ж я думаю, што рэжысура таксама павінна будавацца на класіцы, бо ёсць база, падмурак, да якога можна дадаваць эксперыменты. Па духу ў плане перажыванняў і глыбіні мне бліжэй класічны тэатр, акцёрска-рэжысёрскія спектаклі, калі рэжысёр проста накіроўвае мяне кудысьці, а я сам паглыбляюся ў персанажа. Не вельмі люблю быць марыянеткай у руках рэжысёра, мне бліжэй прапускаць сюжэт праз сябе, чым задавальняць пажаданні пастаноўшчыка. Думаю, што рэжысёр павінен быць вельмі пераканаўчым, каб акцёр паверыў і пайшоў за яго прапановай.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

***Пашыраны тэкст інтэрв'ю чытайце ў свежым нумары газеты «ЛіМ»*** ■


## «СМАК ЖЫЦЦЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 9 кастрычніка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**

**Сярод падпісчыкаў 12.10.2017 года будуць разыграны 7 вяндлярняў электрычных «ТэрмМікс» і суперпрыз — маразільнік Indesit. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22.10.2017 года.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31.12.2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» чытайце ў нумары 171 газеты «Звязда» ад 06.09.2017 года.**

**Тэлефон для даведак (017) 337 44 04.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 7.09.2017 да 31.12.2017.**

**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3087 ад 04.09.2017 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**


МАРАЗІЛЬНІК Indesit SFR 100


Вяндлярня электрычная суцэльнаметалічная «ТэрмМікс»

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________ на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [      ] ________
(індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Серада, 27 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** Зона Х (16+).
**8.50** Слова мітрапаліта Паўла на свята Узвышэння Святога Крыжа.
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.30, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3». (16+).**
**13.15** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.55** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.15** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Драма «Помста». (16+).**
**11.20** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**11.55 Серыял «Шалёны анёл». (12+).**
**14.15, 20.30** «Бітва салонаў». (16+).
**15.15, 23.50 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.20** «Паненка-сялянка». (16+).
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур групавога раўнду. ЦСКА (Масква, Расія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія).
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур групавога раўнду. Агляд гульнявога дня.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранакам».
**7.40, 14.00** «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Людміла Гурчанка». Драма. (12+).**
**9.15, 14.55 «Пані Марыя». Драма. (12+).**
**10.40** «Размовы пра духоўнае».
**10.50** «Свята далёкай зоркі». Памяці народнай артысткі БССР Ірыны Ждановіч.
**11.20, 18.05** «Апошні дзень». Леў Дураў (12+).
**12.20** «Рамантык з Люцынкі». Дак. фільм (12+).
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 2010». Дзень Беларусі.
**14.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.20, 21.05** «Партызаны супраць Вермахта». (12+).
**16.45, 21.35 «Балтыйскае неба». Драма. 2-я серыя. (12+).**
**19.30** «Запіскі на палях». Максім Танк.
**20.10** «24 пытанні». Аляксей Дудараў (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Песні пад гітару».
**23.15** «Мелодыі лета». «Песні нашага стагоддзя».

### Беларусь 5

**7.30** Тэніс. Турнір WTA. Ухань.
**9.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур. «Барусія» (Дортмунд, Германія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**11.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур. Агляд гульнявога дня.
**12.10** Хакей. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ.
**13.50** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч плэй-оф.
**15.35** Козел пра футбол.
**15.55** Хакей. КХЛ. «Авангард» (Омск) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**18.25** Слэм-данк.
**18.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА-Мінск — БГК імя Мяшкова. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.35** Спартыўныя танцы. Міжнародны турнір.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур. Анлайн гульнявога дня. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**13.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.20, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Бацькавы бераг». (16+).**
**23.10 Серыял «Пятля Несцерава». (12+).**
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Усім па катку» (16+).
**9.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50 «Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Тэрыторыя памылак» «(16+).
**15.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**17.35** «Эліксір маладосці» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**0.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.50 «Белыя ваўкі-2». Серыял (16+).**

### МІР

**6.35, 16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.05 «Любімыя акцёры 2.0». Фільм «Экіпаж» (12+).**
**10.30, 5.50** «Любімыя акцёры». Аляксандр Абдулаў (12+).
**11.05, 1.05 Маст. фільм «Усё вырашае імгненне» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Хатняя прыслужніца» (16+).**
**14.25, 3.00** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**19.20 Серыял «Аддзел 44». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Фокуснік-2» (16+).**
**4.15 Маст. фільм «Фокуснік» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35 Серыял «Сваты». (12+).**
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**22.10, 23.10 Серыял «Добрыя намеры». (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Таксістка». (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Лясснік». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.35 Серыял «ППС». (16+).**
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Пёс». (16+).**
**21.30 Серыял «На глыбіні». (16+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Адшукаецца адпачынак» (0+).
**11.00 Камедыя «Дзяўчаты». (12+).**
**12.40, 18.35, 20.45** «Дома ТБ» прадстаўляе.
**13.00** «Самы добры дзень».
**16.05** «Мультпарад».
**16.15 Серыял «Дарагі доктар».**
**17.40 Серыял «Каралева» (16+).**
**18.55** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**19.45 Серыял «Дама пад вуалю».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Хваля». (16+).**
**23.00 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Варонiны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.00, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.15, 4.55** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.40** Трылер «Выкуп». (16+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.45** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Трылер «Закладніца-2». (16+).
**0.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...» (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.00** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Надзея Румянцава.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.30, 22.20** «Кацярына». Серыял.
**9.15** «Дзівы». Дак. серыял.
**9.40, 19.45** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 23.55** ХХ стагоддзе. «Каб быў тэатр. Алег Яфрэмаў». 1987 год.
**12.35** Сусветныя скарбы.
**12.50** Штучны адбор.
**13.35** «Летні палац і тайныя сады апошніх імператараў Кітая». Дак. фільм.
**14.30** Жыццё выдатных ідэй. «Хто запаліў электралямпачку?»
**15.10, 1.20** Крысціна Шофер, Клаўдыё Абада і Люцэрнскі фестывальны аркестр.
**16.05** «Роберт Бэрнс». Дак. фільм.
**16.15** «Пешшу...» Масква бібліятэчная.
**16.40** «Блізкае акружэнне Мікалая Лебедзева».
**17.40** Да 80-годдзя Петэра Штайна. «Тэатр... козы, аліўкі». Дак. фільм.
**20.05** «Кітай. Скарбы нефрытавай імперыі». Дак. фільм.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Абсалютны слых».
**23.10** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Выпраўленаму верыць».
**2.15** «Цэнтр кіравання «Крым». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Легенда рок-н-ролу». 2005 год (18+).
**6.50, 8.30, 9.40, 11.00, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 20.10, 21.40, 23.00, 2.55, 5.25** Музычная настальгія (12+).
**7.05, 13.15, 19.05** Маст. фільм «Д 'Артаньян і тры мушкецёры». (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.30** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар». (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Чорны кастрычнік 93 года». 2005 год (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**0.00** Дак. фільм «Ці будзе камунізм». (16+).
**1.20** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Усерасійскі рэферэндум аб даверы Б. М. Ельцыну». 1993 год (12+).
**2.20** Дак. фільм «Не ў адзін дзень Масква будавалася». (12+).
**4.00** Маст. фільм «Палёты ў сне і наяве». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.30, 10.00, 21.30, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**5.30, 14.00, 22.30** Watts.
**7.00, 12.30, 18.30, 1.05** Снукер. World Open. Фінал.
**8.30, 20.00, 0.00** Веласпорт (шаша). Чэмпіянат свету.
**9.30, 22.00** Аўтагонкі. «Формула-3».
**11.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**14.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Сіднэй-2000.
**15.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Пекін-2008.
**16.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Рыа-2016.
**17.30** Алімпійскія гульні. «Алімпійскія рэкорды».
**18.00** Алімпійскія гульні. «Дзіўныя моманты».
**23.00** Тэніс. Кубак Лэйвера.

### Кінакамедыя

**0.25** Камедыя «Жаніх». (12+).
**2.00** Камедыя «Гонар». (18+).
**3.50, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**5.20** Камедыя «Гуляй, як Бэкхэм». (12+).
**7.20** Камедыя «Ноч у Парыжы». (16+).
**9.00** Меладрама «Дзённік кар'ерысткі». (16+).
**10.35** Камедыя «Голая праўда». (16+).
**12.25** Камедыя «Фартуна Вегаса». (16+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**16.00** Камедыя «Навагодняя жонка». (16+).
**17.45** Камедыя «Шанцуе ж людзям!» (12+).
**19.30** Камедыя «Супермэнеджар, або Матыка лёсу». (16+).
**20.55** Камедыя «Лорд Дракон». (12+).
**22.45** Камедыя «Закусачная на колах». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.20** «Доктар І...» (16+).
**8.50, 19.00, 3.05** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял. (16+).
**10.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял. (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.15** «Варажбіта» (12+).
**14.15, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.05** «Адкрыта» (12+).
**18.00** «Другое дыханне». Серыял. (16+).
**20.55** «Магазіна» (16+).
**21.55** «Рэвізора» (16+).
**23.00, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.30** «Легенда пра Шукальніка». Серыял. (16+).
**0.15** «Чорная архідэя». Дэтэктыў. (16+).
**2.15** «Жанна, пажані» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 16.55** Уцёкі з Шаўшэнка (16+).
**8.55** Кірмаш ганарыстасці (12+).
**11.40** Адваротная цяга (16+).
**14.20** Джэры Магуаэр (16+).
**19.40** Прабач за каханне (16+).
**22.00** Помні (Memento) (16+).
**0.10** Геній (18+).
**2.20** Гэта вельмі смешная гісторыя (16+).
**4.15** Дурдом на колах (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Як я правёў гэтым летам. (16+).
**8.50** Кухня. Апошняя бітва. (12+).
**11.00** Прогулка. (12+).
**12.45** Старое добрае кіно. Гамлет. 1-я серыя. (6+).
**14.20** Горка!-2. (16+).
**16.20, 4.20** Крылы. 1—2-я серыі. (12+).
**18.15** Нашчадкі. (16+).
**20.20** Жаніх. (12+).
**22.20** Жыць. (16+).
**0.05** Кококо. (18+).
**2.00** Ёлкі 1914. (12+).

### National Geographic

**6.00** Займальная навука. (12+).
**6.50, 13.25, 17.15** Гульні розуму. (12+).
**7.40, 22.30** Зрабі або памры. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.10** Ледзяная дарога. (16+).
**9.35, 14.10, 22.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**11.55** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Навука будучыні. (12+).
**15.40** Эвакуацыя Зямлі (12+).
**16.30, 19.30, 0.00, 2.20** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.00, 0.45, 3.55** Дзікі тунец. (12+).
**18.45** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала. (16+).
**20.15** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**21.50, 1.30, 4.45** Зорная размова. (16+).
**23.15, 3.10** Уварванне на Зямлю. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Танкі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Паляўнічыя на антыкварыят. (12+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Голыя і напалоханыя. (16+).
**0.00** Узрываючы гісторыю. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (12+).
**2.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Інжынерныя праліки. (12+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Надыходзячы тыдзень у цэлым будзе спакойны і паспяховы, але залішне расслабляцца не варта. Навакольныя будуць падтрымліваць вас, сябры складуць кампанію ў любых пачынаннях, толькі рабіце што-небудзь, а не ляжыце на канапе. У пятніцу праца стане выдатным рэцэптам ад дрэннага настрою не толькі для вас, але і для тых, каго вы зможаце ўгаварыць далучыцца да сумесных праектаў. Выхадныя можна прысвяціць культурнаму адпачынку. Даўно пара выбрацца ў тэатр ці наведаць выстаўку.



**ЦЯЛЕЦ.** Увесь тыдзень вы, падобна, будзеце ўладжваць праблемы на рабоце. Аднак перш, чым рашуча дзейнічаць, варта ўсё старанна абдумаць. У пачатку тыдня давядзецца некалькі разоў растлумачыць навакольным, што вы ад іх хочаце. Не хвалюйцеся, ваша настойлівасць і ўвага да дэталяў дапамогуць дамагчыся жаданага. У пятніцу, у другой палове дня, актуальная праблема можа паспяхова вырашыцца як бы сама сабой. У выхадныя дні не прымайце ў спешцы важных рашэнняў.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні варта дзейнічаць рашуча, увасабляючы ў жыццё свае планы і задумы, але пры гэтым пажадана заручыцца падтрымкай калег і начальства. У сярэдзіне тыдня не ўспрымайце сур'ёзна плёткі і чуткі, бо інфармацыя будзе занадта скажонай. У чацвер вы праявіце сябе з найлепшага боку ў важнай справе. У пятніцу могуць спатрэбіцца такія якасці, як дысцыплінаванасць і пунктуальнасць. Дзякуючы ім вы паспяхова справіцеся з многімі складанымі задачамі.



**РАК.** У панядзелак вам могуць прапанаваць, на першы погляд, перспектыўную справу, у якую неабходна ўкласці пэўныя рэсурсы, але не спяшайцеся прыняць гэтую прапанову, варта ўсё прадумаць і параіцца са спецыялістамі. Пачынаючы з аўторка сітуацыя зменіцца і дазволіць здзейсніць рывок у кар'еры. У чацвер не варта спрабаваць вырашаць некалькі спраў адначасова. Лепш не спяшацца і зрабіць усё якасна, адклаўшы штосьці на потым. У выхадныя дні вы вельмі лёгка і хутка вырашыце ўсе бытавыя пытанні.



**ЛЕЎ.** Падобна на тое, зараз не час наступаць, магчыма, нават давядзецца пакінуць раней заваяваныя пазіцыі. Пастаўцеся да гэтага працэй. Паспрабуйце не выхваляцца яшчэ не даведзенымі да канца справамі, пра вашу дзейнасць павінны ведаць толькі ў вузкім коле надзейных сяброў. Не варта змагацца за лідарства на рабоце — чым больш калегіяльнасці, тым больш паспяховыя будуць вашы дзеянні. Паспрабуйце дапамагаць тым, хто просіць аб дапамозе па меры сіл і магчымасцяў, пастарайцеся праявіць разуменне. Рэалізоўвайце свае планы на ясную галаву, бо разгубленасць і нявызначанасць могуць прывесці да не самых лепшых вынікаў.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні разумна не ўзвальваць увесь груз клопатаў на сябе, а звярнуцца па дапамогу да сяброў або блізкіх людзей. Панядзелак можа стаць днём, калі ўвасабляюцца жаданні і задумы. Поспех у дзелавой сферы будзе залежаць ад умення дамовіцца і выкарыстоўваць свае сувязі і знаёмствы. У чацвер не варта давяраць новым калегам, бо яны могуць уцягнуць вас у вельмі непрыемную авантуру. Чацвер — спрыяльны дзень для паездак і падарожжаў. У пятніцу можна арганізаваць сустрэчу з сябрамі.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вас усюды будзе суправаджаць лёгкае адчуванне таямнічасці. Што б з вамі ні адбывалася, навакольныя будуць схільныя дзівіцца з гэтых падзей, нават калі вас самога яны зусім не ўсхвалююць. У панядзелак і сераду зможаце вырашыць многія задачы з сапраўды чароўнай лёгкасцю. У аўторак варта памаўчаць, не прымайце паспешлівых рашэнняў, абдумвайце свае ўчынкі па некалькі разоў. У пятніцу вас могуць спакушаць навізной. У гэты дзень добра быць у дарозе, ён спрыяльны для пачатку паездак і падарожжаў.



**СКАРПІЁН.** Надыходзіць спрыяльны перыяд для планавання і абдумвання будучых спраў, прычым гэта будуць вельмі цікавыя, творчыя праекты. На рабоце, хутчэй за ўсё, давядзецца актыўна дзейнічаць і дамагацца сваіх мэт. Навакольныя будуць настроены да вас па-добраму і падтрымаюць многія вашы ідэі. Калі ў суботу захочаца адпачыць, паспрабуйце адмовіцца ад актыўных спраў і правесці гэты дзень у прагулках на свежым паветры з каханым чалавекам.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні праявіце мудрасць і абачлівасць у сваіх рашэннях, бо ад гэтага будзе залежаць далейшае развіццё падзей у прафесійнай сферы і сямейным жыцці. Межы вашага ўплыву могуць пашырыцца, але свае амбіцыі варта трымаць пад кантролем, у запале ёсць небяспека пайсці па лжывым шляху. З'явіцца шанц асвоіць новую спецыяльнасць, удала ажыццявіцца далёкія паездкі і камандзіроўкі. Давядзецца праявіць цярпенне і працавітасць, каб атрымаць прыбытак. Магчымыя пераезды або пачатак рамонту.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні вас можа ўразіць багацце новых думак, ідэй і планаў, якія з'явяцца вакол, некаторыя з іх могуць падацца вар'яцкімі. Немалую ролю ў з'яўленні гэтых ідэй могуць адыграць вашы сябры, заразіўшы сваім прыкладам, прычым самі яны хуценька сыдуць у цень. У гэтай сітуацыі варта ўключыць інтуіцыю і здаровы сэнс, каб не трапіць у непрыемную сітуацыю. Аднак, калі вас нішто не бянтэжыць, смела рухайцеся наперад, менавіта цяпер удасца адным рыўком пераадолець шматлікія перашкоды, якія стаяць на шляху.



**ВАДАЛЕЙ.** Давядзецца выбіраць: вырашаць праблемы з затратай вялікіх сіл ці спыніць спробы і перачакаць, пакуль складанасці не скончацца самі сабой. Вам будзе неабходна адчуць сваю незалежнасць. Паспрабуйце ў дыскусіях не ўпарціцца, настойваючы на сваім пункце гледжання, важна чуць выказванні апанентаў. Магчыма, прыйшоў час змяніць светаадчуванне і бязлітасна выкінуць састарэлыя погляды з жыцця? У пачатку тыдня можаце смела разлічваць на дапамогу і падтрымку блізкіх.



**РЫБЫ.** Гэты тыдзень можа падарыць вам проста лавіну разнастайных магчымасцяў для ўладкавання асабістага жыцця і актыўнага адпачынку. Панядзелак — удалы дзень для апрацоўкі інфармацыі і творчых камандзіровак. У аўторак і сераду чым менш вы будзеце думаць пра ўласную выгаду, тым больш удалымі стануцца вынікі. У вашых сілах дапамагчы блізкім сябрам у складанай сітуацыі. У пятніцу будзе цяжка звязацца з патрэбным чалавекам, што можа пацягнуць праблемы, якія, зрэшты, паспяхова вырашацца ў нядзелю.

## Чацвер, 28 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.30, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3». (16+).**
**13.15** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж. (12+).
**23.55** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Драма «Помста». (16+).**
**11.25, 21.35, 22.10** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**12.00 Серыял «Шалёны анёл». (12+).**
**14.20, 20.35** «На нажах». (16+).
**15.20, 22.50 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.20, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.25** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.40** «Беларуская кухня». Сырнікі з казінага тварагу.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.35** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Людміла Гурчанка». Драма. (12+).**
**9.10, 14.40 «Даурыя». Драма. 1-я серыя. (12+).**
**10.35** «Справа жыцця». Кампазітар Уладзімір Кандрусевіч.
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці сцэнографа, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Армэна Грыгар'янца.
**11.20, 18.05** «Апошні дзень». Фаіна Ранеўская (12+).
**12.20** «...І кружыцца планета Кугляшова». Дак. фільм (12+).
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 2002».
**14.10** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.10, 21.05** «Партызаны супраць Вермахта». (12+).
**16.35, 21.30 «Жаўранак». Драма. (12+).**
**19.30** «Скарына. Дзеля Бога і людзей». Фільм першы.
**20.10** «24 пытанні». Анатоль Ярмоленка (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Песні пад гітару».
**23.15** «Мелодыі лета». «Вольга Залеская і «Яе асяроддзе»».

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур. ПСЖ (Францыя) — «Баварыя» (Мюнхен, Германія).
**9.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і тур. Агляд гульнявога дня.
**10.50** Слэм-данк.
**11.20** Спорт-мікс.
**11.30** Тэніс. Турнір WTA. Ухань. 1/4 фіналу.
**16.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**17.25** Авертайм.
**17.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 2-і тур. «Астана» (Казахстан) — «Славія» (Чэхія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Прэв'ю.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 2-і тур. БАТЭ (Барысаў, Беларусь) — «Арсенал» (Лондан, Англія).
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 2-і тур. «Партызан» (Сербія) — «Дынама» (Кіеў, Украіна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**0.00** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/4 фіналу.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!» (12+).
**10.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.05** «Давай пажэнімся!» (16+).
**12.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**13.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.20, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Бацькаў бераг». (16+).**
**23.10 Серыял «Пятля Несцерава». (12+).**
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Усім па катку» (16+).
**9.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50 «Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.55** «Мінск і мінчане».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**17.35** «Эліксір маладосці» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа» (16+).
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**0.15** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**1.05 «Белыя ваўкі-2». Серыял (16+).**

### МІР

**6.25, 16.15, 5.35 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.10 «Любімыя акцёры». Фільм «Дзяўчаты» (12+).**
**10.45** «Любімыя акцёры». Вера Васільева (12+).
**11.15, 4.15 Маст. фільм «Жанаты халасцяк» (0+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Хатняя прыслужніца» (16+).**
**14.25, 2.55** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**19.20 Серыял «Аддзел 44». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Дачніца» (16+).**
**1.00 Маст. фільм «Фокуснік-2» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху». (16+).
**12.00 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35 Серыял «Сваты». (12+).**
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**22.30, 23.10 Серыял «Добрыя намеры». (12+).**
**0.35** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Таксістка». (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.35 Серыял «ППС». (16+).**
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Пёс». (16+).**
**21.30 Серыял «На глыбіні». (16+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.50, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30** Раніца на восьмым.
**11.00 Драма «Ганебная страсць». (16+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25, 18.05, 19.25, 20.45** «Дома ТБ» прадстаўляе.
**14.45** Дак. фільм «Мара пра Афрыку».
**15.55** «Мультпарад».
**16.10** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**16.40 Серыял «Добры доктар».**
**18.20 Серыял «Выратаваць боса».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**19.45 Серыял «Дама пад вуаллю».**
**20.55** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.20 Драма «Вага вады». (16+).**
**23.10 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.00, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.15, 4.55** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.40** Трылер «Закладніца-2». (16+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.45** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Трылер «Кантракт». (12+).
**0.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...» (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.00** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Аляксей Грыбаў.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.30, 22.20** «Кацярына». Серыял, заключная серыя.
**9.15** «Дзівы». Дак. серыял.
**9.40, 19.45** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** ХХ стагоддзе. «Музычны рынг. Гурт «Сякрэт». 1987 год.
**12.15** «Гульня ў бісер». «М. В. Гогаль. «Вій».
**12.55** «Абсалютны слых».
**13.35** «Кітай. Скарбы нефрытавай імперыі». Дак. фільм.
**14.30** Жыццё выдатных ідэй. «Вайна токаў».
**15.10** Туган Сахіеў і Нямецкі сімфанічны аркестр Берліна.
**15.55, 2.35** Сусветныя скарбы.
**16.15** Пернікавы домік. «Песня абрыкосавага дрэва».
**16.40** «Лінія жыцця». Барыс Галкін.
**17.35** 80 гадоў з дня нараджэння Георгія Рэберга. «Астравы».
**20.05** «Нараджэнне з гліны. Кітайскі фарфор». Дак. фільм.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма. Робі Лакатош».
**23.00** Колер часу. Жан-Эцьен Ліатар. «Прыгожая шакаладніца».
**23.10** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Адзіное змагар з зямным прыцягненнем».
**23.55** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**1.40** Джозэф Калея, Антонія Папана і Каралеўскі аркестр Нідэрландаў Кансэртгебаў.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Чорны кастрычнік 93 года». 2005 год (16+).
**6.55, 8.45, 9.40, 11.00, 14.10, 15.40, 17.00, 20.45, 21.40, 23.00, 0.50, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.15, 13.05, 1.05** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Руслан Хасбулатаў «Адкрыццё». 2007 год (16+).
**18.55** Праграма «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
**19.30** Маст. фільм «Агледзіны». (16+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Легенда рок-н-ролу». 2005 год (18+).
**5.30** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 9.30, 21.30, 1.30** Веласпорт (шаша). Чэмпіянат свету.
**5.30, 11.00, 17.30, 19.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**7.30** Аўтагонкі. «Формула-3».
**8.00, 16.00, 20.00, 2.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**8.30, 14.00, 23.00** Снукер. World Open. Фінал.
**13.00, 15.30, 19.00, 0.30** Watts.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Дзіўная сваякі». (16+).
**2.15** Камедыя «Тата напракат». (12+).
**4.05** Прыгоды «Чалавек — швейцарскі нож». (18+).
**5.45** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**7.15** Камедыя «Уцёкі». (16+).
**9.00** Прыгоды «Ас з асаў». (16+).
**10.50** Камедыя «Завадатары». (16+).
**12.25** Камедыя «Шалёныя грошы». (16+).
**14.15** Камедыя «Выпадковы муж». (16+).
**16.00** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**16.15** Драма «Платон». (16+).
**17.55** Камедыя «Жаніх». (12+).
**19.30** Камедыя «Парыж любой цаной». (16+).
**21.05** Камедыя «Скандынаўскі фарсаж». (16+).
**22.45** Камедыя «Забойны футбол». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 2.30** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял. (16+).
**10.35, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял. (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.05** «Трэндзі» (16+).
**15.35** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**17.05** «Адкрыта» (12+).
**18.00** «Другое дыханне». Серыял. (16+).
**20.50** «90-я» (16+).
**21.40** «Рэвізора» (16+).
**22.40, 5.35** «Алігарх ТБ» (16+).
**23.10** «Легенда пра Шукальніка». Серыял. (16+).
**23.55** «Эфект матылька». Фантастыка. (16+).
**1.45** «Хэллоў, Раша!» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.55** Па-за часам (16+).
**8.25** Помні (Memento) (16+).
**10.45** Дзіця за $ 30 000 000 (16+).
**13.20** Прабач за каханне (16+).
**15.50** Дурдом на колах (16+).
**20.10** Патрыёт (16+).
**23.20** Далёка-далёка (12+).
**2.00** Лабірынт Фаўна (16+).
**4.05** Знесеныя ветрам (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Жыць. (16+).
**8.05** Жаніх. (12+).
**10.05** Ён — Дракон. (6+).
**12.20** Старое добрае кіно. Гамлет. 2-я серыя. (6+).
**14.05** Ёлкі 1914. (12+).
**16.20, 4.20** Крылы. 3—4-я серыі. (16+).
**18.10** Граф Мантэнегра. (12+).
**20.20** Выпрабаванне. (16+).
**22.20** Поўнае ператварэнне. (16+).
**0.10** Я — настаўнік (Хатняя вайна, або Змоўшчыкі). (12+).
**2.10** Кухня ў Парыжы. (12+).

### National Geographic

**6.00** Займальная навука. (12+).
**6.50, 17.15, 20.15** Гульні розуму. (12+).
**7.35, 22.30** Зрабі або памры. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.45, 11.05** Ледзяная дарога. (16+).
**9.30** Дзікі тунец. (12+).
**11.50** Аўта-SOS. (12+).
**12.35** Навука будучыні. (12+).
**13.20** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**14.10, 22.55, 5.10** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**15.40** Горшае надвор'е ў гісторыі? (16+).
**16.25, 18.00, 19.30, 21.00, 0.00, 2.15, 3.45** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.45** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала. (16+).
**21.45, 1.30, 4.30** Зорная размова. (16+).
**23.15, 3.00** Уварванне на Зямлю. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Танкі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Загадкі планеты Зямля. (16+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Востраў. (16+).
**0.00** Гандляры касмасам. (12+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Голыя і напалоханыя. (16+).

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

# СКАРЫНІЯНА НАЗАЎСЁДЫ

**Усё добрае чамусьці заўсёды хутка заканчваецца. Вось і наша вандроўка па шляхах Скарыны і яго кніг падыходзіць да лагічнага завяршэння. Была яна з даволі пакручастымі сцежкамі, крочыць па якіх некаторыя стаміліся ўжо на сярэдзіне падарожжа. Але — мы былі ў тым упэўненыя, бо добра ведаем сваіх чытачоў, — большасць годна прыйшла да фінішу.**

Хтосьці спіпла і сцісла адказваў толькі на пытанні, не называючы нават свайго прозвішча. Хтосьці дасылаў прыгожыя лісты, афармленыя ілюстрацыямі, з падрабязнымі дэталямі ў адказах, паведамляючы сёе-тое і пра сябе. Удзельнічалі ў віктарыне сем'і і гурткі па інтарэсах, пенсіянеры, малаdыя людзі і школьнікі. Допісы прыходзілі з усіх куточкаў Беларусі. Яшчэ адно сведчанне таго, што Францыск Скарына для беларусаў — не проста гучнае імя. І ведаць пра яго і яго дзейнасць як мага больш для многіх справа нацыянальнага гонару.

Пытанні віктарыны былі розныя — шукаючы адказ на адны, дастаткова было зазірнуць у каляндар, каб адказаць на іншыя — не заўсёды мог дапамагчы нават інтэрнэт. Адказаць беспамылкова на ўсе трыццаць пытанняў не ўдалося нікому з удзельнікаў. Як і было задумана, самымі складанымі (асабліва ў апошніх двух турах) аказаліся пытанні ад Нацыянальнай бібліятэкі: першай друкарняй на тэрыторыі Беларусі многія назвалі Нясвіжскую (замест Брэсцкай), а другім беларускім друкаром пасля Скарыны называлі і Сымона Буднага, і Пятра Мсціслаўца, і, вельмі блізка падабраўшыся да ісціны, — Мікалая Радзівіла Чорнага. Але ж князь быў заснавальнікам і фундатарам Берасцейскай друкарні, а вось уласна друкаром — тым, хто працаваў у ёй, — быў ураджэнец Кракава Бэрнард Ваяводка (толькі адзін з удзельнікаў віктарыны правільна назваў гэта імя).

У любым выпадку, падарожжа было цікавае і пазнавальнае. Прызнаемся: прыдумваючы пытанні для кожнага тура віктарыны, і мы нямала новага даведаліся пра нашага першадрукара. Як і, спадзяёмся, не толькі ўдзельнікі віктарыны, але і ўсе чытачы «Звязды». А веды — іх жа за плячыма не насіць. Тым больш, калі размова ідзе пра беларуса, знакамітага на ўвесь свет.

А яшчэ гэта віктарына паказала вельмі важную дэталь: нашы чытачы не страцілі цікавасці да падобных інтэлектуальных гульняў. Таму абяцаем: хутка, акурат пад доўгія восеньскія вечары, вас чакае новая «зарадка для мазгоў» ад «Звязды». Галоўнае, не забудзьцеся выпісаць газету на наступны квартал — падпіска ідзе акурат цяпер.

Друкуем адказы на пытанні трэцяга тура віктарыны і імёны яе пераможцаў, якія, як і абяцалі, патрапяць у Нацыянальную бібліятэку на адмысловую бясплатную экскурсію і змогуць на свае вочы пабачыць арыгіналы Скарынавых кніг.

## АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ ТРЭЦЯГА ТУРА ВІКТАРЫНЫ «МАЯ СКАРЫНІЯНА»

**1.** *Адукацыйным цэнтрам якой рэспублікі быў горад Падуя, ва ўніверсітэце якога ў 1512 годзе Францыск Скарына атрымаў ступень доктара лекарскіх навук?*

Падуя ў скарынаўскія часы была адукацыйным цэнтрам **Венецыянскай рэспублікі.**

**2.** *Біблія Скарыны — пяты па ліку надрукаваны пераклад Святога Пісання. На якіх чатырох жывых мовах Біблія была выдадзена да скарынаўскай?*

Да нашай Біблії ў друкаваным варыянце былі выдадзеныя кнігі **на нямецкай, італьянскай, чэшскай і галандскай мовах.**

**3.** *Якімі знакамі Скарына нумараваў старонкі сваіх выданняў?*

Старонкі сваіх кніг Скарына нумараваў не рымскімі лічбамі і не арабскімі, а **кірылічнымі — літарамі алфавіта.**

**4.** *У якой з кніг Скарыны змешчана гэта гравюра?*



Гравюра называецца «Маісей перад народам», яна была змешчаная **ў Кнізе Другога закона, выдадзенай у Празе ў 1519 годзе.**

**5.** *Адзіную з кніг Біблії Скарына выдаў двойчы. Якую?*

**Псалтыр** — адзіная кніга, якую Скарына выдаў двойчы. З яго пачынаецца першае пражскае выданне Біблії, з яго ж пачынаецца і «Малая падарожная кніжка», выдадзеная ў Вільні.

**6.** *У фільме «Я, Францыск Скарына» галоўную ролю — самога першадрукара — іграе Алег Янкоўскі. А каго ў тым жа фільме іграе яго старэйшы брат Расціслаў?*

Расціслаў Янкоўскі і ў фільме застаецца братам Алега — ён выконвае **ролю Івана Скарыны.**

**7.** *Хто аўтар кнігі пра Скарыну, якая пачынаецца з прысвячэння: «Усім маці кругу светлага паднябесця, імёны якіх сёння людзям невядомыя, ды імёнамі сыноў якіх землі розных куткоў кругу паднябеснага славіцца не перастануць...»*

Гэта словы эпіграфа да **эсэ Алега Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае».**

**8.** *Чыё імя да нядаўняга часу насіў праспект Францыска Скарыны ў Полацку?*

Да 2009 года галоўная вуліца Полацка насіла **імя Карла Маркса.**

**9.** *Дзе ў Беларусі пастаянна экспануюцца арыгіналы Скарынавых выданняў?*

Арыгіналы Скарынавых выданняў, што захоўваюцца ў нашай краіне, можна пастаянна ўбачыць **у экспазіцыі Музея кнігі ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

**10.** *Пытанне ад Нацыянальнай бібліятэкі. Хто быў другім пасля Францыска Скарыны друкаром у Вялікім Княстве Літоўскім?*

**Бэрнард Ваяводка.** Менавіта ён узначаліў першую на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарню, якая дзейнічала ў 1550—1570-я гады ў Бярэсці, прыехаўшы туды па запрашэнні заснавальніка друкарні Мікалая Радзівіла Чорнага.

### Пераможцамі віктарыны «Мая Скарыніяна» сталі:

**Вікторыя ПЯРЛУХІНА**, вёска Такарышкі Іўеўскага раёна;
**Сям'я КУНЧЭВІЧ** (школьніца Паліна, студэнтка Дар'я і мама Святлана Уладзіміраўна), вёска Агарэвічы Ганцавіцкага раёна;
**Уладзімір ДРАБЫШЭЎСКІ**, Полацк;
**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ**, Глуск;
**Ірына ГЛАДКАЯ**, аграгарадок Чачкава Мінскага раёна;
**Антаніна ЕРАМЕЕВА**, вёска Вуглы Рагачоўскага раёна;
**Вольга ГАЙКЕВІЧ**, Столін;
**Мікіта СУГАКОЎ**, Наваполацк;
**Аляксандр ГАНЧАРОЎ**, вёска Нісімкавічы Чачэрскага раёна;
**Алена ГРЫГАРОВІЧ**, вёска Дакудава Лідскага раёна;
**Сям'я ЧАРНЯКОВЫХ-ГАЛІЦКІХ**, Буда-Кашалёва;
**Юлія САЎРЫЦКАЯ**, Мінск;
**Эма ВАСІЛЕВІЧ**, Мінск;
**Каманда «БІЛІНГВА»**, Мінск.

*(Арганізатары віктарыны ў найбліжэйшы час звяжуцца з пераможцамі, каб абмеркаваць дэталі маючай адбыцца экскурсіі).*

## Фестывалім

# ПЕСНІ ПРА ГАЛОЎНАЕ

**У Магілёве чакаюць удзельнікаў міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер — 2017».**

Ён адбудзецца ў апошні тыдзень кастрычніка, але ўжо стала вядомая праграма мерапрыемства. Сярод зорак мінулых гадоў, якія завітаюць у горад, Ігар Карнялюк, Юрый Лаза, Аляксандр Сяроў, Эдзіта П'еха, Віктар Рыбін і Наталля Сенчукова, Вольга Пірагс, Афрык Сіман, група «Джой» і шмат хто яшчэ, без каго нельга ўявіць сабе эстраду 80—90-х гадоў. У праграме канцэрты з удзелам салістаў Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага і У. І. Неміровіча-Данчанкі, Каралеўскага опернага тэатра Італіі і тэатра В. Беліні. На свой сольнік запросіць народны артыст Расіі Аляксандр Малінін, адбудуцца канцэрты джазавай музыкі, аркестра баяністаў імя П. Смірнова, ансамбля «Сіняя птушка». Дарэчы, міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер» упершыню адбыўся ў лістападзе 1995 года пры падтрымцы Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. Узнікла ідэя сабраць разам вядомых выканаўцаў былых гадоў, каб захаваць і працягнуць найлепшыя традыцыі музычнай культуры, а таксама аб'яднаць культурную прастору краін СНД і далёкага замежжа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*






## Неасабісты суб'ектыў

# MEMENTO MORI



### Чаму мы не беражом жыццё сваё і іншых

ПАЧАТАК мінулых выхадных у мяне асабіста быў невясёлы. Машына імчала праз вымыты дажджом сонечны ранак да роднай вёскі, мільгалі за вокнамі знаёмыя краявіды, ахінутыя лёгкім флёрам спакойнага харасства, якое бывае толькі на пачатку восені. («Калі душа ўсяе прыроды з тваёю злучыцца душою ў адным суладдзі і настроі...» Лепш за Коласа пра гэты час ніхто не напісаў, дый не напіша, напэўна, ніколі.) У машыне побач ехалі родныя людзі, дома чакала маці са смачным сняданкам. А настрой быў самы паганы. Не ішлі з галавы тыя чужыя дзеці, што загінулі напярэдадні вечарам на чыгуначным пераездзе пад Іванавам. Гартала на тэлефоне стужку навін, шукала падрабязнасці таго здарэння, чытала сваім спадарожнікам уголас. Насуперак завядзёнцы, калі ўсю дарогу размаўляем, жартуем, рагочам, гэтым разам у машыне было панурае маўчанне, бы пахавалі нядаўна каго. Мы сапраўды ў думках гаравалі па іх, тых незнаёмых дзецях, чыё жыццё так па-дурному, так незразумела бязглузда скончылася ў два, тры, шаснаццаць, дваццаць два гады...

І ў празрыстым настылым паветры, здавалася, трымцела тая страшная бяда, якая накрыла далёкую палескую вёску, у якой ніхто з нас ніколі не быў і да гэтага дня пра існаванне якой нават не ведалі. Чатыры пахаванні адначасова. Тры труны, дзве з якіх зусім маленькія — у адной сям'і. Ад аднаго толькі ўяўлення і праз тыдзень сціскаецца сэрца. А як перажылі іх бацькі? Божа, як перажылі іх бацькі?!.

СЛЕДСТВА, безумоўна, праз нейкі час паведаміць усе падрабязнасці гэтай страшнай трагедыі. Але наўрад ці яны зменшаць бязглуздасць і невытлумачальнасць таго, што адбылося. Бо ва ўсіх дэталях застанецца няменны чыгунка, якая сама па сабе зона асаблівай небяспекі, лакаматыў, які імчыць да пераезда, мікрааўтобус, які на хуткасці едзе да таго ж пераезда. Лакаматыў сігналіць, а дваццацідвухгадовы юнак за рулём мікрааўтобуса, не звяртаючы на гэта і на чырвонае святло ўвагі, вырашае праскочыць. Нязменным застанецца і страшны вынік гэтага ліхацтва: чатыры загубленыя жыцці і два — чатырохгадовай дзяўчынкі і пятнаццацігадовага падлетка — пад пагрозай, за іх змагаюцца ўрачы ў Брэсце.

На жаль, гэта страшная гісторыя так і застанецца ў многім нявытлумачанай, бо галоўны сведка і, напэўна, вінаўнік у гэтай справе ляжыць на вясковых кладах. І няма як спытаць у яго, назаўсёды 22-гадовага: «Саша, Сашачка, аб чым жа ты думаў, калі ціснуў на газ перад самым цягніком?» Як і не спытаеш яшчэ аднаго 18-гадовага нябожчыка з Баранавіч, які не менш бязглузда загінуў на пару дзён пазней, таксама на чыгунцы, — ён па рэйках (!?) ішоў у навушніках і не чуў цягніка, які яму сігналіў. Перад смерцю хлопец яшчэ і намучыўся, — яму адрэзала ногі і частку рукі, памёр у бальніцы. Якая мука бацькам і сваякам — гэта нават уявіць цяжка. А яшчэ гэта незададзенае пытанне і пошук адказу на яго...

УВОГУЛЕ, вы не заўважалі, што апошнім часам мы нярэдка абясцэньваем уласнае жыццё, ставімся да яго з недаравальнай лёгкасцю? У нашых анёлаў-ахоўнікаў проста няма перадыху, бо мы то кідаемся бегчы на чырвонае святло, то кідаемся даганяць электрычку проста перад іншай, то лезем без броду ў ваду... Пэўна, як ні парадаксальна гучыць, гэта прыкмета спакойнага квітнеючага грамадства, дзе няма вайны, эпідэмій, тэрактаў, дзе смерць становіцца нечым далёкім і амаль нерэальным. І пачынаеш адчуваць сябе як кінагерой: калі бяжыш перад машынамі, абавязкова праскочыш, калі ныраеш на злом галавы — абавязкова выплывеш. Гэта я пра нас з вамі, пра дарослых. А што ўжо казаць пра маладых, пра нашых дзяцей, у якіх жыццё рэальнае напалову пераімяшанае з жыццём віртуальным, у якім паняцце «смерць» увогуле ўмоўнае: калі ў камп'ютарнай гульні цябе забіваюць, ты проста націскаеш кнопку адмены і пачынаеш гульню наноў, і твой герой зноў жывы-здаровы.

